УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к.
Зьмена адрасу: мясцовага—10 к., іншагародняга—20 кап.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нонпарэлі (паслядняя [illegible])—50 кап. Для Масквы і Ленінграда—1 р. Паспрыяй [illegible] Пры шматразовым [illegible] на [illegible]. Згодна пост. СНК ад 10 верасьня 1924 г. бярэцца зьверх [illegible] 10 [illegible] падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы газ. „Зьвязда"—г. Менск, Савецкая 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. У акруговых гарадох—у аддз. Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

Зьвязда

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎН. КАНТОРА.
1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начная рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. веч. тэл. № 6-42
Кіраўн. Гал. Канторай Канторы абвестак і падпіскі } тэл. № 781.

СЕРАДА, 25 СТУДЗЕНЯ 1928 г.
№ 21 (2828)
Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.
Год выданьня дванаццаты.

Паскорыць разгляд заяў па кастрычнікавым закліку

Кампанія масавага ўцягненьня ў партыю рабочых і работніц у парадку кастрычнікавага закліку, згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, павінна быць закончана да 1-га лютага 1928 года. Да гэтага-ж тэрміну павінен быць закончан разгляд усіх паданых у парадку кастрычнікавага закліку заяў ад рабочых аб паступленьні ў партыю.

Гэта пастанова ЦК КП(б)Б абавязвае мясцовыя партыйныя камітэты значна паскорыць работу па афармленьні кастрычнікавага прыёму. Весткі з акругкомаў КП(б)Б аб ходзе гэтае работы на 1-га студзеня 1928 года паказваюць, што з разглядам заяў на мясцох **наглядаецца вялікае затрыманьне**. Паводле няпоўных даных, па БССР было падана заяў аб прыёме ў партыю па кастрычнікавым закліку 4.826, прынята-ж у партыю з пачатку кампаніі да 1-га студзеня 1928 года 2.295 або 47,5 проц. Калі ўлічыць, што масавы прыцёк заяў закончыўся яшчэ ў пачатку сьнежня, дык трэба прызнаць, што тэмп разгляду заяў зьяўляецца зусім нездавальняючым.

Больш ад усіх адстае ў гэтай справе Аршанская і Магілеўская акругі. У Воршы, напрыклад, з паданых 257 заяў, прынята да 1-га студзеня—45 або 17 проц., у Магілеве з 217 заяў прынята 49 або 22 проц. Бабруйская, Віцебская, Полацкая і Гомельская акругі даюць больш высокі процант прыёму (Бабруйск—40 проц., Віцебск — 43 проц., Полацак—49 проц., Гомель—52 проц.), але і гэтыя процанты зьяўляюцца зусім невыстарчальнымі. Калі гэта работа і надалей будзе праходзіць такім-жа тэмпам, дык няма ніякай упэўненасьці ў тым, што пастанова ЦК будзе выканана ў тэрмін.

Важным тормазам у афармленьні кастрычнікавага закліку ў некаторых выпадках зьяўляецца несваячасовы разгляд заяў на пленумах партыйных камітэтаў і несваячасовае скліканьне саміх пленумаў. Гэта затрыманьне трэба будзе зжыць шляхам нечарговых пленумаў, асабліва ў тых мясцох, дзе процант разгледжаных заяў вельмі нізкі.

Пасьля кампаніі кастрычнікавага закліку работа па ўцягненьні ў партыю рабочых і работніц ні ў якім разе не павінна аслабнуць. Уздым, дасягнуты ў гэтай работе ў часе кампаніі, павінен быць захаван. Партыйныя ячэйкі павінны разглядаць работу па ўцягненьні ў партыю рабочых і работніц, як галоўнеўшую задачу, якую яны павінны праводзіць з дня ў дзень **сыстэматычна**. Трэба самым рашучым чынам весьці барацьбу з існуючымі дзе-ніздзе поглядамі, быццам самае лепшае, што было ў рабочай клясе, ужо прынята ў партыю, што зараз, нібы, не засталося ўжо каго прымаць. Такі погляд у радзе выпадкаў наглядаўся яшчэ і да кастрычнікавага закліку. Больш ста тысяч заяў, паданых у ходзе кампаніі кастрычнікавага закліку, поўнасьцю зьмянілі такі погляд, паказаўшы яго няжыцьцёвасьць і рэакцыйнасьць. І сапраўды, рабочая кляса непарыўна высоўвае з сваёй масы ўсё новыя і новыя пласты актыву. На розных галінах прафсаюзнай і грамадзкай работы выхоўваюцца гэтыя новыя кадры актыву, узьнімаюцца ў сваім культурна-палітычным разьвіцьці і цягнуцца да партыі. Трэба толькі паставіць сыстэматычную паглыбленую работу з актывам, трэба пастаянна пашыраць кола актыву, трэба заўсёды мець перад сабою задачу ўцягненьня ў партыю лепшай часткі гэтага актыву. Тады не паўторыцца такое зьявішча, якое мела месца ў большасьці ячэек, што на працягу цэлага году амаль зусім ня было прыёму ў партыю, а ў кампанію кастрычнікавага закліку заявы падаваліся дзесяткамі ў тых-жа ячэйках.

Асабліва неабходна падкрэсьліць задачу ўсямернага ўмацненьня ўцягваньня ў партыю батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых. Кастрычнікавы заклік, ня гледзячы на тое, што ён закрануў і гэтыя групы рабочых, даў пакуль што вельмі нязначныя лічбы іх прыёму ў партыю. З ліку 2.295 па кастрычнікавым закліку на 1-га студзеня прынята толькі 36 чал. або 1,6 проц. Гэтыя лічбы паказваюць, што кастрычнікавы заклік амаль не закрануў досыць значнага для БССР пласта рабочых, занятых у сельскай гаспадарцы. Тым больш неабходнай зьяўляецца задача сыстэматычнае работы па ўцягненьні іх у партыю зараз.

XV зьезд УсесКП(б) і XI зьезд КП(б)Б паставілі гэту задачу, як першачарговую, перад усімі вясковымі партарганізацыямі. Трэба зараз-жа разгарнуць работу па практычным ажыцьцяўленьні гэтае дырэктывы.

Сельскія касы ашчаднасьці і сялянская пазыка

Вельмі важнае значэньне для ўсіх працаўнікоў дзяржаўных кас ашчаднасьці на мясцох у бліжэйшыя месяцы павінна набыць пытаньне аб удзеле кас ашчаднасьці ў справе рэалізацыі і ўкараненьня ў вясковыя масы нова - выпушчанае сто-мільённае пазыкі «ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі».

Вясковыя касы ашчаднасьці, якія нахоняцца сярод гушчаў сялянскіх мас, могуць адыграць буйную ролю ў справе рэалізацыі гэтае пазыкі. Вясковыя касы ашчаднасьці павінны ня толькі ўзяць актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі, але і ў забесьпячэньні спосабаў дасягнуцьня пазыкі ў руках сялянства.

Для гэтае мэты сялянскія касы ашчаднасьці, з аднаго боку, павінны растлумачыць селяніну практычныя выгады і мэтазгоднасьць цьвёрдага трыманьня аблігацыі пазыкі, а з другога боку, павінны быць створаны ўмовы, пры якіх трымальнік-селянін мог-бы заўсёды атрымаць прыбытак па купонах, здаць аблігацыю на захаваньне ў крэдытную ўстанову, атрымаць пад яе пазычку і г. д.

У зьвязку з гэтым галоўная ўправа дзяржаўных кас ашчаднасьці ўжо паставіла пытаньне аб увядзеньні прасьцейшых апэрацый з процантнымі паперамі непасрэдна ў сельскіх касах. Пытаньне гэта ў бліжэйшы час атрымае сваё вырашэньне. Але ўжо цяпер неабходна прыняць меры да таго, каб ва ўсіх гэтых касах бесьперашкодна праводзілася аплата купонаў па пазыцы.

Побач з работаю, якую праводзяць сельскія касы ашчаднасьці па рэалізацыі пазыкі, неабходна таксама ўзмацніць растлумачальную работу аб значэньні кас ашчаднасьці як для дзяржавы, так і для сялянства.

У агітацыйнай кампаніі па пазыцы ўзмацненьня сельскай гаспадаркі **значную ролю** павінны адыграць насьценныя газэты. Да гэтай пары нашы насьценныя газэты нават у горадзе вельмі слаба адгукаліся на кампанію па распаўсюджаньні пазыкі.

Між тым насьценная газэта, пры ўмелым яе складаньні, зьяўляецца магутным сродкам прапаганды, які неабходна скарыстаць як можна шырэй.

Тэмп разьвіцьця ашчаднае справы пасьля праведзенага «двух-тыднёвіка зьберажэньняў» аслабеў. Пры такім вялізным значэньні кас ашчаднасьці ў справе ўцягваньня часова вольных сродкаў насельніцтва ў агульнае рэчышча дзяржаўнага крэдыту зьяўляецца зусім недапушчальным.

Сельскія касы ашчаднасьці павінны праявіць сябе як у адносінах рэалізацыі пазыкі, так і ва ўзмацненьні работы па ашчаднай справе.

П.

Пасол СССР у францускага прэзыдэнта

Урачысты прыём тав. Даўгалеўскага

ПАРЫЖ, 23. Агэнцтва «Гавас» паведамляе:

„Сёньня ў 4 гадзіны дня прэзыдэнт рэспублікі прыняў у афіцыйнай аўдыенцыі Даўгалеўскага, які перадаў яму вярыцельныя граматы, што акрэдытуюць яго ў якасьці надзвычайнага і поўнамоцнага пасла Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у Парыжы. Даўгалеўскі і супрацоўнікі пасольства прыбылі ў Елісейскі палац у аўтамабілях прэзыдэнцкага гаражу і ў суправаджэньні шэфа пратакольнай часьці міністэрства замежных спраў Бэк де-Фук'ера і яго памоцніка. У момант прыбыцьця пасла ў Елісейскі палац, батальён 24-га пяхотнага палка аддаў яму вайсковы гонар. Каля пэрону палацу пасла сустракаў палацовы камендант палкоўнік Броса. Даўгалеўскі быў прадстаўлены прэзыдэнту де-Фук'ерам. Побач з прэзыдэнтам сталі міністр замежных спраў. Акрамя таго, у дадзе цэрэмоніі прысутнічалі: генэральны сакратар канцылярыі прэзыдэнта Жуль Мішэль, начальнік вайсковае канцылярыі генэрал Ласон, начальнік габінэту Росі, яго памоцнік Вэнса, начальнік сакратарыяту і афіцэры, якія знаходзяцца пры прэзыдэнце рэспублікі. Даўгалеўскі і Думэрг абмяняліся прамовамі".

ПРАМОВА ТАВ. ДАЎГАЛЕЎСКАГА.

ПАРЫЖ, 23. Перадаючы вярыцельныя граматы францускаму прэзыдэнту Думэргу, пасол СССР тав. Даўгалеўскі сказаў:

«Урад і народы СССР цвёрда парашылі захоўваць і ўмацоўваць справу міру. Я прысьвячу сябе ажыцьцяўленьню гэтай справы, пераконаны, што добрая згода між народамі СССР і Францыі дапаможа ўсеагульнаму міру. Урад СССР, з задавальненьнем адзначаючы разьвіцьцё эканамічных зносінаў з Францыяй, даручыў мне дамагацца зьнішчэньня ўсіх перашкод на гэтым шляху. Спадзяючыся, што перамовы, удала пачатыя маім папярэднікам, будуць працягвацца і дадуць станоўчыя вынікі. Запэўняючы, што з майго боку будуць ужыты ўсе сілы для ажыцьцяўленьня гэтага, прашу аказаць мне давер'е і спадзяюся спаткаць падтрыманьне з боку францускага ўраду».

АДКАЗНАЯ ПРАМОВА ДУМЭРГА

У адказнай прамове Думэрг заявіў:

„Рад чуць вашы запэўненьні, што ўжываць ўсе сілы для захаваньня ўсеагульнага міру і наладжаньня больш шчыльных узаемаадносін між нашымі краінамі. Запэўняю, што вы спаткаеце поўнае падтрыманьне з боку францускага ўраду, які спадзяецца, што ўсе нявырашаныя пытаньні будуць упарадкаваны ў імя паляпшэньня адносін між нашымі краінамі і на карысьць справы ўсеагульнага міру".

* * *

ПАРЫЖ, 23. 21-га студзеня Брыян быў у паўнамоцнага прадстаўніка СССР Даўгалеўскага з адкавным візытам.

„Моцная ўлада"

Нямецкая буйная буржуазія дамагаецца стварэньня „моцнай улады" праз пашырэньне праў дэнтральнага ўраду.



Індыя ня верыць „рабочым" дзеячом Англіі

Заява лідэра індыйскага нацруху Нэру

ЛЁНДАН, 16. Лідэр індыйскага нацыянальнага руху Нэру ў часе сваёй пабыўкі ў Парыжы па дарозе ў Эгіпэт у гутарцы з прадстаўнікамі друку даў наступны адказ на апошнюю заяву Макдональда, які пратэставаў супроць байкоту камісіі Саймона:

„Мы ў Індыі даўно ўжо перасталі меркаваць аб ангельскіх палітычных дзеячох па іх словах. Толькі іх учынкі значаць для нас нешта, але ў нас няма ніякага сумненьня ў тым, што дзейнасьць парляманцкае фракцыі рабочае партыі цалком разьходзіцца з яе словамі. Напамінаць, што па зьезьдзе ў Блэкпуле Макдональд бараніў рэзалюцыю, якая выказвалася на карысьць самакіраўніцтва Індыі, значыць, толькі лішні раз пакрыўдзіць яго. Зусім відавочна, што Макдональд утварыў нейкую сакрэтную згоду з міністрам па справах Індыі Біркенхэдам, калі ён сам прызнае, што якраз Біркенхэд пераканаў яго ў тым, што індыйская камісія будзе карыснай. Макдональд, як ведама, вельмі моцна верыць у парляманцкія мэтады. З жалем і зьдзіўленьнем я гляджу на магутную партыю ў найстарым парляманце, якая апусьцілася гэтак ніска, што займаецца закулісьнымі інтрыгамі і зьдзелкамі і заво іх парлямацкімі мэтадамі".

ПЕРАМОГА ЛЕВАЕ МЕНШАСЬЦІ НА КАНФЭРЭНЦЫІ РУРСКІХ ГАРНЯКОЎ

БЭРЛІН, 23. Учора адбылася дэлегацкая канфэрэнцыя горнарабочых Рурскага раёну, скліканая агульна-нямецкім саюзам горнарабочых. У канфэрэнцыі бралі ўдзел каля 700 дэлегатаў. Уступны даклад зрабіў старшыня агульна-нямецкага саюзу горнарабочых Гузэман, які адзначыў, што рэальная зарплата горнарабочых Рурскага раёну значна ніжэйшая за даваенную; па разьмерах свайго заработку рурскія горнарабочыя сталіць на 15-ым месцы ў сьпісе 24-х катэгорый рабочых найважнейшых галін прамысловасьці. У заключэньне Гузэман уніёс рэзалюцыю аб павышэньні зарплаты.

Пасьля дакладу пачаліся ажыўленыя спрэчкі. Прадстаўнікі левай меншасьці падкрэсьлівалі поўнук невыстарчальнасьць рэзалюцыі Гузэмана і дамагаліся неабходнасьці весьці барацьбу ня толькі за павышэньне зарплаты, але і за скарачэньне рабочага дня. У якасьці першага кроку ў гэтай барацьбе яны прапанавалі адмяніць ад існуючых зараз згод аб зарплаце і звышнормавых работах. Разам з тым, прамоўцы левай мешасьці пратэставалі супроць выразу, які знаходзіцца ў рэзалюцыі і поўнасьцю ўхваляе палітыку кіраўнікоў саюзу ў пытаньні аб зарплаце, бо гэта палітыка да гэтага часу прыводзіла да бязупынных уступак прадпрыемцам. Прадстаўнікі прафсаюзнае бюракратыі, у адказ на крытыку з боку левай меншасьці, нападалі, як заўсёды, на камуністых і на камуністычны друк.

З прычыны таго, што настрой большай часткі дэлегатаў выразна схіляўся на карысьць патрабаваньняў левай меншасьцю, Гузэман палічыў неабходным уключыць гэтыя патрабаваньні ў прапанаваную ім рэзалюцыю. Аднагалосна прынятая канфэрэнцыяй рэзалюцыя падкрэсьлівае невыстарчальнасьць зарплаты і ўзмоцненую экспляатацыю рабочай сілы, якая зьяўляецца вынікам капіталістычнай «рацыяналізацыі»; рэзалюцыя патрабуе павышэньня зарплаты і скарачэньня рабочага дня, пры чым даручае прафсаюзным органам адмовіцца не пазьней 1-га сакавіка ад згоды аб звышнормавых работах і не пазьней 1-га красавіка—ад існуючай тарыфнай згоды.

„СУРПРЫЗ" ЗЛУЧАНЫМ ШТАТАМ

НА ПАНАМЭРЫКАНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

АДПОР ЛАТЫНСКАЙ АМЭРЫКІ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ П.-А.-З.-Ш.

НЬЮ-ЁРК, 23. Па зьвестках з Гаваны, мэксыканская дэлегацыя на панамэрыканскай канфэрэнцыі ўнесла праект рэарганізацыі панамэрыканскага саюзу. Праект імкнецца паслабіць ролю ЗлучаныхШтатаў у саюзе і прадугледжвае, што старшыня і генэральны дырэктар (кіраўнік справамі) саюзу павінны чаргавацца па чарзе з ліку прадстаўнікоў усіх уваходзячых у саюз дзяржаў; чарга ўстанаўляецца ў альфабэтным парадку дзяржаў. Да гэтага часу гэтыя пасады былі ўвесь час заняты прадстаўнікамі Злучаных Штатаў. Акрамя таго, праект прадугледжвае адмену правіла, якое цяпер дзейнічае і згодна якому прадстаўнікамі дзяржаў Латынскай Амэрыкі ў саюзе зьяўляюцца пасланьнікі гэтых дзяржаў у Вашынгтоне; такім чынам, праект прадастаўляе дзяржавам Латынскай Амэрыкі магчымасьць больш свабоднага выбару сваіх прадстаўнікоў.

Праект мэксыканскай дэлегацыі зьявіўся неспадзяваным для прадстаўнікоў Злучаных Штатаў, якія разлічвалі, што мэксыканцы будуць усяцэла падтрымліваць іх лінію ў імя „палітыкі прымірэньня" паміж Злучанымі Штатамі і Мэксыкай. Як відаць, мэксыканскі ўрад сапраўды хацеў-бы падтрымліваць на канфэрэнцыі Злучаныя Штаты, але прымушан быў выступіць са сваім праектам пад уплывам тых настрояў, што пануюць у Цэнтральнай і Паўднёвай Амэрыцы і выяўляюцца ў спробах барацьбы супроць дыктатуры Злучаных Штатаў на амэрыканскім кантынэнце. Але как задаводзіць Злучаныя Штаты, дэлегацыя ўнясла пастанову, у якой гаворыцца, што панамэрыканскі саюз не павінен ажыцьцяўляць якую-небудзь палітычную ролю.

Дэлегаты Злучаных Штатаў і падалей падкрэсьліваюць сваю „прымірыцельную палітыку". Як адзначаюць у палітычных колах, дэлегацыя разлічвае, што граючы на супярэчнасьцях паміж Італіяй і пажаданьнямі дзяржаў Латынскай Амэрыкі, яна зможа папярэдзіць якое-небудзь агульнае выступленьне супроць Злучаных Штатаў на панамэрыканскай канфэрэнцыі.

Гутаркі аб „вечным міры" і... падрыхтоўка да вайны

НЬЮ-ЁРК, 23. Адмірал Чарльз Плэнкет, начальнік „марскога адпраўленьня у Брукліне (нью-ёрскі порт), выступаючы ў суботу з прамовай на публічным сходзе, заявіў, што Злучаныя Штаты нямінуча набліжаюцца да вайны, якая выбухне на глебе эканамічнае канкурэнцыі. Газэтныя справаздачы аб прамове Плэнкета высьвятляюць яе ў тым сэнсе, што Плэнкет прадракаў англа-амэрыканскую вайну. З прычыны „няўлоўкасьці" такіх прадказаньняў з боку амэрыканскага адмірала, Плэнкет на другі дзень агаласіў абвяржэньне, запэўняючы, што ён у сваёй прамове „не ўспамінаў спэцыяльна аб Англіі".

КІТАЙ

10 млн. даляраў за прыдушэньне рабочых арганізацый

ШАНХАЙ, 23. Як паведамляюць, кантонскія прадпрыемцы абяцалі даць уладзе пазыку ў 10 мільёнаў даляраў, калі ўлада ўжыве рашучыя меры супроць рабочых арганізацый. У зьвязку з гэтым кантонскі камісар працы загадаў распусьціць усе прафсаюзы, якія далучаюцца да рэвалюцыйнае рады прафсаюзаў. Паводле чутак, на радзе патаемных рабочых сходаў ухвалены рэзалюцыі аб падрыхтоўцы забастоўкі пратэсту.

Дамаганьне нэйтралізацыі Шанхаю

ТОКІЁ, 23. Як паведамляе шанхайскі карэспандэнт агэнцтва „Сімбун Рэнго", дзелавыя колы Шанхаю прапануюць пакінскаму ўраду абвясьціць Шанхай нэйтральным горадам з перадачаю адміністрацыйна-паліцэйскіх функцый яго грамадзянам.

Японія без парляманту

ПАЛІЦЭЙСКАЯ ПАДРЫХТОЎКА ВЫБАРАЎ

ТОКІЁ, 23. Пасьля роспуску парляманту прэмэр Танака апублікаваў заяву, у якой гаворыцца, што ўрад пастанавіў правесьці новыя выбары, бо апазыцыя праявіла намер займацца абструкцыяй. У дэкларацыі партыі Мінсэйта гаворыцца, што роспуск парляманту прадстаўляе сабой удушэньне грамадзкае думкі і зроблена з мэтаю затаўкаць апазыцыі рот.

ТОКІЁ, 23. Парляманцкія выбары вызначаны афіцыйна на 20-га лютага. Усяго павінна быць абрана 464 дэпутаты. Лідэры апазыцыйнай партыі Мінсэйта выказваюць надзею, што з апазыцыйных кандыдатаў 80 проц. будуць абраны ў парлямант. Урад чыніць рыхтуецца да выбараў, наладжваючы нарады ня толькі з губэрнатарамі правінцый, але і з кіраўнікамі паліцыі і судовымі ўладамі.

„Моцная ўлада"

Нямецкая буйная буржуазія дамагаецца стварэньня „моцнай улады" праз пашырэньне праў дэнтральнага ўраду.

Маніфэстацыя памяці Леніна

Ў НЬЮ-ЁРКУ САБРАЛА 20.000 УДЗЕЛЬНІКАЎ.

НЬЮ-ЁРК, 23. У арганізаванай учора ў Нью-Ёрку маніфэстацыі, прысьвечанай памяці Леніна, узялі ўдзел звыш 20.000 рабочых. Прамоўцы, якія выступалі перад маніфэстантамі, ілюстравалі вучэньне Леніна аб імпэрыялізьме на прыкладзе ваеннае чыннасьці П-АЗШ у Нікарагуа і на палітыцы Злучаных Штатаў у Кітаі. Была ўхвалена рэзалюцыя, якая выказвае рэзалюцыйнае прывітаньне войску Сандзіно ў Нікарагуа (што змагаецца супроць падпяволваньня Нікарагуа Злучанымі Штатамі і супроць рэакцыйнай дыктатуры), патрабуе выдаленьня войска Злучаных Штатаў з Кітаю, заклікае да падтрыманьня бастуючых у П-АЗШ вуляканаў і абвяшчае аб адкрыцьці кампаніі па вярбоўцы новых членаў у Уоркерс-парты (камуністычная).

30-тысячная дэманстрацыя парыскага прадетарыяту

ПАРЫЖ, 23. Дэманстрацыя ў Левалуа (прадмесьце Парыжу), наладжаная учора ў знак пратэсту супроць пазбаўленьня прафсаюзаў іх праў і за амністыю для палітычных, прайшла з вялікім уздымам. У дэманстрацыі бралі ўдзел каля 30.000 парыскіх рабочых. У раёне дэманстрацыі і турмы Сантэ былі згуртованы вялікія нарады паліцыі, якая баялася, што камуністы зробяць спробу вызваліць з турмы камуністычных дэпутатаў. Частка дэманстрантаў хацела накіравацца ў цэнтр гораду, але паліцыя не дапусьціла да гэтага. Спэцыяльны выпуск „Юманітэ" з заклікам да парыскага гарнізону прыняць удзел у дэманстрацыі быў канфіскаваны. Камуністы, якія прадавалі гэты выпуск, былі затрыманы, але пасьля допыту вызвалены. Супроць адказнага рэдактара „Юманітэ" Гэя ўзьнята справа на абвінавачаньні яго ў закліку саздат да непаслушэньства.

ПЕРАД ВЫБАРАМІ Ў ПОЛЬСКІ СОЙМ

Сьпіс блёку меншасьцяй канчаткова складзены

ВІЛЬНЯ, 23. „Курэр Віленскі" паведамляе, што ўсе ўнутраныя пытаньні ў блёку нацыянальных меншасьцяй, зьвязаныя з вызначэньнем сьпісу кандыдатаў, канчаткова вырашаны. Другое і сёмае месца ў дзяржаўным сьпісе атрымаюць яўрэі.

Разгон мітынгаў паліцыяй

ВАРШАВА, 23. У Лодзі паліцыя разагнала мітынг, наладжаны лявіцаю ППС. Удзельнікі мітынгу рабілі паліцыі супраціўленьне. Многія арыштаваны.

У Павонсках (рабочы раён Варшавы) адбыўся рад лятучых рабочых мітынгаў на вольным паветры. Паліцыя разганяла мітынгі. Зроблена шмат арыштаў.

„Бунд" не дапучыўся да блёку меншасьцяй

ВІЛЬНЯ, 23. З усіх яўрэйскіх арганізацый толькі „Бунд" выступае на выбарах самастойна, рэшта-ж арганізацый — супольна з блёкам нацыянальных меншасьцяй.

Камітэт лявіцы ППС

ВІЛЬНЯ, 23. У Вільні ўтварыўся выбарчы камітэт лявіцы ППС, у склад якога ўвайшлі Гадомскі і Гофман.

Беларускія арганізацыі на выбарах

ВІЛЬНЯ, 23. „Курэр Віленскі" паведамляе, што апроч існуючых беларускіх выбарчых камітэтаў: 1) рабоча-сялянскага (радыкальнага), 2) аб'яднаннага камітэту (беларускія нацыяналісты) і 3) дэфэнзіўнае групы Паўлюкевіча, арганізаваўся яшчэ адзін, чацьверты выбарчы камітэт: „галоўны выбарчы камітэт рабочых і сялян", начале з Янкам Станкевічам.

У склад камітэту уваходзіць А. Астроўская (жонка арыштаванага грамадзяніна Астроўскага) і рад іншых асоб.

Арыштавана 76 чалавек

ВАРШАВА, 23. У апошнія дні арыштавана 76 чалавек, большасьць якіх абвінавачваецца ў распаўсюджаньні перадвыбарных камуністычных лістовак і развешваньні плякатаў.

Тры украінскія сьпісы ў Львове

ЛЬВОЎ, 23. У Львове украінцы выстаўляюць тры сьпісы кандыдатаў. Першы сьпіс—УНДА (ў украінскія нац.-дэм.) другі—блёку украінскіх радыкальных сацыялістых, групы «Уперад», украінскай рабочай партыі і львоўскага саюзу. Трэці сьпіс выстаўляе „Сяльроб".

НАЧНОЕ РАДЫЁ

Замежны пралетарыят ушаноўвае памяць Леніна

БЭРЛІН, 24. Як паведамляюць з Амстэрдаму, 4-ая гадавіна сьмерці Леніна была адзначана ў большасьці буйных гарадоў Галяндыі публічнымі маніфэстацыямі. У Амстэрдаме ў дэманстрацыі ўдзельнічала 1.600 чалавек.

* * *

РЭВЕЛЬ, 24. Рабочая партыя арганізавала ў Рэвелі вялікі мітынг у адзнаку гадавіны сьмерці Леніна. Выступаўшыя аратары пратэставалі проці нядаўняй пастановы зьезду эстонскіх прафсаюзаў аб далучэньні да Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу.

Барацьба з паўстанцамі ў Нікарагуа

НЬЮ-ЁРК, 24. Новы атрад амэрыканскага войска ў ліку 1.000 чалавек з артылерыяй выехаў з мясцовасьці Лесна (у паўночна-заходняй частцы Нікарагуа) для барацьбы з паўстанцамі.

Няўдалая спроба

ЛЁНДАН, 24. У Гузістане—на поўдні Пэрсыі—адбылося паўстаньне мясцовых плямёнаў. Паўстаньне арганізавалі ангельскія нафтавікі з мэтаю ўтварыць „незалежны Гузістан", які-б зрабіўся кутком ангельскага ўладаньня ў паўночна-заходняй Індыі, дзе Англія мае вялікіх перашкоды ў правядзеньні сваёй імпэрыялістычнай палітыкі.

Тры зьмены, 7 гадзін працы

ЦЬВЕР, 23. Сёньня на тэкстыльнай фабрыцы імя Вагжанава пераведзены на 7-мігадзінны рабочы дзень яшчэ адзін ткацкі аддзел з 644 варштатамі. Усяго цяпер працуе 3 зьмены пры 1.303 варштатах. Рэшта 1.166 варштатаў будуць пераведзены на 7-мігадзінны рабочы дзень і 3-х зьменную работу праз дні тыдні.

Наступленьне Амэрыкі на Эўропу

Амэрыка дала пазыку Польшчы і атрымала права кантролю над польскай фінансавай палітыкай. Амэрыка зьбіраецца пераглядзець плян Дауэса, каб яшчэ больш закабаліць Нямеччыну, атрымаўшы ў свае рукі нямецкія прамысловыя і чыгуначныя акцыі. Амэрыка дае пазыку Італіі, Аўстрыі і Вэнгрыі. Амэрыканскі банкір Лямонт зьбіраецца даць буйную пазыку Японіі. Вядомы амэрыканскі мільянэр, аўтамабільны фабрыкант Форд, атрымаў у Бразіліі буйнейшую канцэсію на разьвядзеньне каучукавых плянтацый.

Амэрыка, Амэрыка і Амэрыка. Кожны дзень чуеш што-небудзь новае аб выступленьні амэрыканскага капіталу на тым ці іншым вучастку сусьветнага фронту. Усё гэта паказвае, што цэнтр цяжкасьці сусьветнай эканомікі пераносіцца ў Злучаныя Штаты.

Чым вытлумачыць такі зрух? Яшчэ да вайны адчувалася, што маладая Амэрыка пачынае выпяраджваць старую Эўропу. Вялізарнейшыя і самыя познастайныя прыродныя багацьці краіны далі магчымасьць амэрыканскай буржуазіі разгарнуць гарачую дзейнасьць. Злучаныя Штаты маюць каля паловы сусьветных залежаў вугалю і жалезнае руды, здабываюць каля трох чвэртак сусьветнай здабычы нафты і атрымліваюць звыш паловы сусьветнага ўраджаю бавоўны. Далей, моцна разьвітая сетка рэк дае магчымасьць шырока скарыстоўваць гідра-электрычную энэргію. Ня досыць выкарыстаная зямля, яшчэ да гэтага часу вельмі ўраджайная, рознастайны клімат даюць магчымасьць атрыманьня вялікай колькасьці с.-г. прадукцыі і розных відаў с.-г. сырцу для прамысловасьці. Да таго-ж, вялікі лік насельніцтва (каля 120 мільёнаў) дае магчымасьць для разьвіцьця масавай прадукцыі і яе стандартызацыі.

Усе гэтыя спрыяючыя ўмовы яшчэ ў апошнія гады перад вайною далі магчымасьць Злучаным Штатам заняць адно з перадавых месц у сусьветнай эканоміцы. Вайна яшчэ больш узмацніла сусьветную ролю Злучаных Штатаў. Да ўступленьня ў вайну амэрыканскія капіталістыя пасьпелі зарабіць мільярды на ваенных пастаўках саюзьнікам. Потым, пасьля далучэньня да саюзьнікаў (вясною 1917 году), Злучаныя Штаты сталі ў адносінах да іх банкірам, і з сваёй яшчэ больш разгорнутай прамысловасьцю і сьвежаю арміяй адразу зрабіліся рашаючаю сілаю ў грандыёзнай напружанай барацьбе, якая абхапіла ўвесь сьвет.

Урэшце, пасьля пераможнага заканчэньня вайны, ня толькі не пацярпеўшы, але яшчэ больш узмацніўшы сябе ў ёй, амэрыканскі імпэрыялізм удала выкарыстаў на сусьветных рынках той пэрыяд, калі яго саюзнікі былі заняты ў сябе дома загойваньнем сваіх глыбокіх ран. Амэрыканскія капіталістыя захапілі новыя важныя эканамічныя пазыцыі ў Эўропе, Цэнтральнай і Паўднёвай Амэрыцы, у Канадзе, а таксама і ў Азіі. І хоць некаторыя з гэтых пазыцый потым былі адабраны эўрапейскімі канкурэнтамі, узмоцненае праніканьне амэрыканскага імпэрыялізму ў новыя рынкі ў агульным і цэлым адбываецца шпаркім тэмпам. І калі агульны сусьветны гандаль у 1925 г. яшчэ нямнога адставаў ад даваеннага ўзроўню (98 проц.), дык замежны гандаль Злучаных Штатаў да таго часу перавысіў даваенны амаль у паўтара разы (143 проц.). У такой-жа прапорцыі прыблізна вырасла і дабываючая прамысловасьць Злучаных Штатаў.

Разам з тым, Злучаныя Штаты, якія былі да вайны даўжніком Эўропы, сталі сусьветным крэдыторам, сусьветным банкірам-ліхвяром. Эўрапейскія краіны на падставе асобных згод абавязаліся выплаціць Злучаным Штатам на працягу 62 год каля 22 мільярдаў даляраў (даляр раўняецца 2 руб.). Такім чынам Злучаныя Штаты закабалілі ня толькі цяперашняе, але і будучае пакаленьне. Да таго-ж і прыватныя амэрыканскія капіталістыя ўклалі ў іншыя краіны капіталаў на суму каля 10-ці мільярдаў даляраў.

Але нявольна ўзьнікае пытаньне. Ня ўжо-ж магчыма, што ўсе эўрапейскія краіны на працягу 60 дзесяткаў год будуць адбываць „прыгон" для групкі амэрыканскіх рывайійцаў? Няўжо-ж Злучаныя Штаты будуць у стане атрымліваць назад даўгі, калі-б нават даўжнікі сталі іх выплачваць? Бо плаціць яны могуць альбо золатам, альбо таварамі. Золата-ж амэрыканскі капітал ужо перацягнуў да сябе палову ўсяго сусьветнага запасу. Ён ужо і цяпер чуць ня душыцца ад „залатога ажырэньня" і больш гэтага мэталю, хоць і каштоўнага, яму не патрэбна. Наплыву чужаземных тавараў у Злучаныя Штаты ён таксама дапусьціць ня можа, бо гэта зробіць канкурэнцыю для амэрыканскай прамысловасьці.

Ствараецца такім чынам сваясасаблівае „гора ад багацьця", — зачарованае кола, з якога амэрыканскаму капіталізму вырвацца ня так лёгка. Труднасьць яго становішча пацьвярджаецца і крахам на біржы ў Нью-Ёрку ў першыя дні студзеня, які зьяўляецца адным з аднак эканамічнага крызісу, што насоўваецца на Злучаныя Штаты, ці, у крайнім выпадку, сур'ёзных эканамічных ускладненьняў.

XV зьезд УсеКП(б) і XI зьезд КП(б)Б аб працы сярод беднаты

Цэнтральным месцам у дырэктывах XV зьезду ЎсеКП(б) і XI зьезду КП(б Б па працы ў вёсцы зьяўляецца задача калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Ажыцьцяўленьню гэтай галоўнейшай дырэктывы партызьездаў павінна быць падпарадкавана ў бліжэйшыя гады ўся праца на сяле партыйных, савецкіх, каапэрацыйных і інш. арганізацый і ўстаноў, пад гэтым мунктам погляду асабліва выразна павінна разгортвацца праца сельска гаспадарчай і крэдытнай каапэрацыі і праца зямельных органаў. Асабліва значную ролю ў вырашэньні гэтае задачы павінна адыграць буйная сацыялістычная прамысловасьць («ведущее начало») і рабочая кляса, як кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе. Змычка пралетарскага гораду з бядняцка-серадняцкай вёскай, лёзунг «тварам да вёскі» у шматлае рашэньняў XV зьезду ЎсеКП(б) і XI зьезду КП(б)Б становіцца асабліва актуальным (важным) і патрабуе новага зьместу і новых мэтадаў свайго ажыцьцяўленьня.

Нямалаважную ролю ў справе калектывізацыі сельскае гаспадаркі павінна адыграць ініцыятыва і самадзейнасьць самога сялянства, асабліва вясковае беднаты. Пад гэтым пунктам погляду павінна весьціся растлумачэньне сялянству пасе поў партызьезду; выклікаць і ўсяляк падтрымліваць гэту ініцыятыву і самадзейнасьць у сялянства, 10-процантныя адлічэньні з прыбыткаў каапэрацыі на каапэраваньне беднаты, зробленыя ў часе яе апошніх перавыбараў, поўнасьцю і па простым прызначэньні на працягу бліжэйшых двох-трох месяцаў скарыстаць, ухіліўшы ранейшыя недахопы ў гэтай працы, калі бадай палова фондаў на працягу цэлага году ня была скарыстана і калі каапэраваньне беднаты насіла часта фармальны характар.

«Партыйныя і каапэрацыйныя арганізацыі павінны дабіцца стварэньня вакол пытаньняў каапэраваньня беднаты неабходнае грамадзкае думкі сярод малазаможных пластоў вёскі, ставячы гэтае пытаньне на сходах і групах беднаты. Асабліва актыўнай зьяўляецца наступная работа з каапэраванымі бядняцкімі гаспадаркамі, вывучэньне і ўважлівыя адносіны да запатрабаваньняў гэтых гаспадарак і паллік вынікаў работы з імі»,— такія дырэктывы даў XI зьезд КП б)Б па гэтым пытаньні.

Разам з тым у мэтах вызваленьня маламоцных безінвэнтарных сялянскіх гаспадарак з пад ўплыву кулацкіх элемэнтаў, скарыстоўваючых свой інвэнтар (сел.-гасп. машыны і інш.) дзеля закабаленьня беднаты, дана дырэктыва разгарнуць пры сел.-гасп. каапэрацыі поплеч з дзяржаўнымі шырокую сетку пракатных пунктаў, якія маюць машыны маламоцным гаспадаркам на льготных умовах і садзейнічаюць развіцьцю грамадзкіх прыёмаў апрацоўкі зямлі, уборкі ўраджаю і г. д.

Павялічэньне фондаў беднаты па дзяржаўным і мясцовым бюджэтах з наданьнем гэтым фондам вытворча-каапэрацыйнага прызначэньня (калхозы і, асабліва, розныя прасьцейшыя таварыствы), павялічэньне долі беднаты ў агульным крэдыце як грашовымі, так і машыннымі, падрыхтоўка каапэрацыйнага актыву з вясковае беднаты і скарыстаньне яго на практычнай рабоце ў каапэрацыі,—уся работа сельска-гаспадарчай каапэрацыі павінна весьціся пад пунктам погляду поўнага забесьпячэньня інтарэсаў беднаты і маламоцнага сялянства, пад пунктам погляду калектывізацыі сельскай гаспадаркі, бяднейшага і маламоцнага сялянства ў першую чаргу.

XV зьезд партыі даў дырэктыву скараціць тэрмін земляўпарадкаваньня па СССР і правесьці земляўпарадкаваньне бядняцкіх і маламоцных сялянскіх гаспадарак за кошт дзяржавы, пры чым гэтыя мерапрыемствы, як і наогул праца па земляўпарадкаваньні, павінны шчыльна быць увязаны з інш. арганізацыйна-гаспадарчымі мерапрыемствамі (аградапамога, крэдыт, мэліярацыя, машынавабясьпечаньне і г. д.). Акрамя таго пры правядзеньні земляўпарадкаваньня неабходна сачыць, каб інтарэсы бяднейшага сялянства забясьпечваліся і пры самым адводзе зямлі (якасьць, размеркаваньне і інш.). Разам з тым XI зьезд КП(б)Б даў дырэктыву «ўзмацніць тэмп работы на стварэньні і адшуканьні новых зямельных фондаў для надзяленьня і данадзяленьня безьзямельных і малазямельных, зьвярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на далейшае разгортваньне мэліярацыйных работ, а таксама працягваць працу па абрэзцы поўпрацоўных гаспадарак».

У галіне дадатковага абкладаньня XV партызьдзам дана дырэктыва сачыць за тым, каб пастанова партыі і савецкай улады аб вызваленьні маламоцнага сялянства (35 проц. сялянскіх гаспадарак па Саюзе) ад сельска-гаспадарчага падатку выконвалася са ўсёй дакладнасьцю. Разам з тым дана дырэктыва дамагацца больш дакладнага падліку прыбытковасьці найбольш заможных колаў вёскі ў мэтах пераходу да найбольш поўнага прагрэсыўна-прыбытковага іх ападаткаваньня.

Перад саюзам сельска-гаспадарчых і лясных рабочых зьездам пастаўлена задача больш актыўнай працы па арганізацыі яшчэ неарганізаваных батракоў, а роўным чынам і па хутчэйшым уцягненьні ў саюз тых паўпралетарскіх элемэнтаў на вёсцы, для якіх праца на найме зьяўляецца галоўнай крыніцай іх існаваньня. Акрамя таго, зьезд даручыў адпаведным органам павесьці падрыхтоўчую працу па распрацоўцы неабходных мерапрыемстваў для правядзеньня на бліжэйшым зьезьдзе саветаў законаў аб страхаваньні ад старасьці маламоцных сялян. XV зьезд УсеКП(б) зьвярнуў таксама ўвагу ўсіх партарганізацый на ўсямернае ўмацаваньне таварыстваў сялянскае ўзаемадапамогі з тым, каб яны сталі сапраўднай масавай арганізацыяй бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі, па аказаньні ўзаемадапамогі і арганізацыі гаспадарчых мерапрыемстваў, якія аблягчаюць становішча маламоцных сялян. Пры чым зьезд указаў, што, працягваючы работу па індывідуальнай дапамозе беднаце, неабходна ўсё больш і больш накіраваць работу камітэтаў узаемадапамогі ў бок вытворча-калектыўнай дапамогі маламоцнаму сялянству.

У галіне савецкага будаўніцтва партызьездамі даны дырэктывы, каб як у перавыбарах саветаў, так і ў штодзённай працы роля вясковае беднаты была павялічана. Трэба ўпартай арганізацыйна-выхаваўчай працай сярод беднаты дабіцца выкананьня гэтай галоўнейшай дырэктывы, трэба пры дапамозе беднаты змагацца за яшчэ больш выразную клясавую лінію на ўсёй рабоце нізавога савецкага апарату.

Пытаньні культурнага будаўніцтва на вёсцы таксама партызьезды ўдзялілі шмат увагі. «Дабіцца значнага павялічэньня ахвату школай (усіх ступеняй) дзяцей с.-г. рабочых, батракоў і беднаты, для чаго неабходна стварэньне асобнага школьнага фонду дапамогі дзецям беднаты. Ужыць усе меры для забесьпячэньня сапраўднай мажлівасьці навучаньня ў школах дзяцей беднаты і асабліва падростка, працуючых па найме, прыёмышаў» і г. д.—такая дырэктыва XV зьезду ў адносінах беднаты ў галіне абслугоўваньня яе школай. Зусім зразумела, што і ў культурна-масавай рабоце на сяле (хаты-чытальні, кіно-перасоўкі, радыё і інш.) трэба мець на ўвазе як мага больш поўнае абслугоўваньне вясковае беднаты ў першую чаргу.

Выкананьне вызначаных вышэй аспоўных дырэктыў XV зьезду ЎсеКП(б) і XI зьезду КП(б)Б па працы сярод вясковае беднаты залежыць у першую чаргу ад мясцовых партыйных арганізацый (ячэек, райкомаў і акругкомаў). Неабходна праверыць практыку, набытую ў працы сярод беднаты да гэтага часу, неабходна больш рашучае і сыстематычнае разгортваньне гэтай працы зараз, пасьля дырэктыў XV і XI партызьездаў. Сходы і групы беднаты, сельскія і раённыя нарады, канфэрэнцыі груп беднаты, вытворчыя нарады сялян беднякоў і сераднякоў, больш выразная і з большай адказнасьцю правадзімая праца вясковых савецкіх, каапэрацыйных і грамадзкіх устаноў і арганізацый,—вось галоўныя шляхі і мэтады, па якіх павінны ажыцьцяўляцца дырэктывы партызьездаў па працы сярод беднаты, па якіх павінна весьціся наступленьне на кулацтва і капіталістычныя элемэнты ў сельскай гаспадарцы.

С. Гарбуз.

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ

Бядняцкім гаспадаркам больш увагі

600.000 руб. адпускае крэдыту Белсельбанк на загатоўку насеньня. Белсельсаюзам ужыты меры—каб поўнасьцю забясьпечыць паказальнымі с.-г. машынамі сялянскія гаспадаркі

Белсельсаюзам плян будзе выканан

Загатоўка канюшыны, прадугледжаная па пляне Белсельсаюзу, заканчваецца:

а) наўночна-ўсходняя канюшына ў колькасьці 6 вагонаў ужо атрымана на мясцох;

б) атрымана паведамленьне, што эстонская канюшына ў колькасьці 3.500 пуд. адгружана і гэтымі днямі павінна паступіць на месцы у Полапак і Віцебск;

в) мясцовае канюшыны, якое па плане павінна быць загатоўлена 10.000 пуд., загатоўлена да гэтага часу каля 8.000 пуд., рэшта 2.000 пуд. будуць загатоўлены ў бліжэйшы час і адпраўлены на месцы.

Загатоўка насеньня сэрадэлы закончана, і зараз гэта насеньне рэалізуецца па мясцох.

Вікі на сёньняшні дзень загатоўлена 50 проц. прадугледжанае па плане колькасьці. Да загатоўкі вікатае паданы ўжыты адпаведныя меры.

Загатоўка насеньня лубіну пачалася і вынікі яе будуць даны ў сакавіку месяцы.

Кораньплоды, насеньне цімафееўкі, лугавых траў Белсельсаюзам заказаны і маюць быць атрыманы ў лютым месяцы.

Насеньня аўсу і ячменю прадугледжана загатовіць каля 200.000 пуд. Да гэтага часу закуплена ўжо каля 76.000 пуд., рэшта загатаўляецца на мясцох, згодна ўказаньняў Белсельсаюзу.

Белсельсаюзам заказан цэлы рад мінэральных угнаеньняў: суперфасфату каля 3 з паловаю тысяч тон, галоўным чынам, у ільнаводчыя раёны. Заказаны і чакаюцца калійная соль, фасфарытная мука і чылійская салетра.

Да вясеньняй пасеўнай кампаніі Белсельсаюз загатовіў 33.000 плугоў; заявы з месц на іх у даны час ужо дасягнулі 34.000.

Загатоўлены барона спружынныя, жалезныя «зіг-заг», культыватары і сеялкі.

Уся патрэбнасьць у паказаных сельгасмашынах і прыладах будзе здаволена поўнасьцю. Завоз іх на месцы ўжо адбываецца і будзе закончан у лютым сакавіку.

Г.

Мерапрыемствы Белсельбанку

Белсельбанк апрача звычайнага банкаўскага крэдыту на вучоце пасеўлёў адпусьціў сельска-гаспадарчай каапэрацыі і Цэнтраземскладу спэцыяльных мэтавых крэдытаў на загатоўку насеньня для вясеньняй пасеўнай кампаніі 880.000 рублёў, з іх 150.000—на загатоўку насеньня аўсу і ячменю, рэшта 730.000- на загатоўку насеньня, траў і ільну.

На загатоўку сельска-гаспадарчых машын і мінэральных угнаеньняў прадастаўлен крэдыт тым-жа арганізацыям у суме 600.000 рублёў.

У распараджэньні Белсельбанку яшчэ мэтавых крэдытаў на 200.000 рублёў, якія таксама будуць выкарыстаны на загатоўку насеньня.

На пляне вытворчага крэдытаваньня сельскае гаспадаркі па Белсельбанку на другі квартал 1927-28 год адпускаюцца крэдыты для калектыўных і адзіночных сялянскіх гаспадарак на мерапрыемствы для падрыхтоўкі да пасеўнае кампаніі: на рабочую жывёлу—200.000 рублёў, на сельска-гаспадарчыя машыны—500.000 рублёў, на мінэральныя ўгнаеньні—300.000 рублёў, на насеньне траў—300.000 рублёў, на насеньне ячменю і аўсу—100.000 рублёў, на ільняное семя—100.000 рублёў, на насенневодзтва—60.000 рублёў і на малочную справу—200.000 рублёў. Апрача таго, асобна адпушчана: для калгасаў—480.000 рублёў, для саўгасаў—675.000 рублёў і па фондзе беднаты для крэдытаваньня бядняцкіх сялянскіх гаспадарак—142.000 рублёў.

Частка сродкаў, як на рабочую жывёлу, с.-г. машыны, малочную справу, калгасам і па фондзе беднаты, ужо праведзены Белсельбанкам на месцы. Астатняя частка крэдыту прадугледжваецца да перавозу ў лютым і сакавіку месяцах.

Рэшта крэдытаў, якія прадугледжаны гадавым планам Белсельбанку на мерапрыемствы па пасеўнай кампаніі, будзе адпушчана ў пачатку трэцяга кварталу (у красавіку месяцы г. г.).

Белсельбанкам узбуджана хадайніцтва перад цэнтральным Сельбанкам аб дадатковым водпуску 300.000 рублёў на крэдытаваньне насельніцтва насеньнем траў.

Даны дырэктывы крэдытным таварыствам на мясцох пры водпуску крэдытаў адзіночным гаспадаркам **у першую чаргу забясьпечыць імі бядняцкія гаспадаркі**, а таксама забясьпечыць патрэбнасьці серадняцкіх гаспадарак, зусім не дапушчаючы крэдытаваньня заможных гаспадарак.

—в.

Цэнтраземскад загатовіць 91.830 пуд. насеньня

Згодна пляну, Цэнтраземскład павінен загатовіць да пасеўнай кампаніі бягучага году насеньня канюшыны 14.000 пуд., цімафееўкі—1.830 пуд., сэрадэлы—7.000 пуд., вікі—27.000 пуд., лубіну—30.000 пуд.

Як-жа пасоўваюцца загатоўкі?

У адносінах канюшыны плян выкананы поўнасьцю, нават з невялікім перавышэньнем. Цэнтраземскład заключыў дагавары на 12.000 пуд. канюшыны. Частка яе ўжо атрымана, рэшта мае быць атрымана ў бліжэйшым будучым.

Тры вагоны канюшыны закуплена беларускай—прадукцыі саўгасаў.

Насеньня цімафееўкі і сэрадэлы большая частка ўжо закуплена, рэшта будзе загатаўляцца з мясцовага рынку.

Што датычыць насеньня вікі і лубіну, яны павінны быць закуплены на мясцовым рынку. Калі-ж мясцовага насеньня вікі і лубіну ня хопіць, дык прадугледжваецца ўвезьці яго з-за межаў Беларусі.

Насеньня гародных культур і кораньплодаў паводле пляну Цэнтраземскладу прадугледжана загатовіць на 50.000 руб. Загатоўка праведзена поўнасьцю, паступленьне гэтага насеньня чакаецца ў сярэдзіне лютага. Частка з іх загатоўлена на мясцовым рынку, другая частка выпісана з Даніі, дзе насеньне па якасьці лічыцца першагатунковым.

Е.

На нямалаважным вучастку

(Да нарады заг. жанаддзелаў пры ЦК КП(б)Б)

Сёньня пры ЦК КП(б)Б адкрываецца шырокая нарада жанаддзелаў партыйных камітэтаў з удзелам прадстаўніц ад больш буйных прадпрыемстваў. На нарадзе маюць быць высьвятлены пытаньні аб задачах масавай працы сярод работніц і сялянак, аб выніках перавыбараў дэлегацкіх сходаў у 1927-28 годзе і аб задачах працы на нова абраных дэлегацкіх сходах і аб стане працы з жаночым актывам.

Пытаньню працы сярод жанчын наша партыя ўдзяляла і ўдзяляе назвычайна многа ўвагі, а трудносьць і складанасьць гэтае працы, яе важнасьць у справе перабудовы грамадзтва на сацыялістычных падставах, вымагаюць ад нас яшчэ большае ўвагі.

Мы цяпер з упэўненасьцю можам сказаць, што пералом у адносінах да працы сярод жанчын з боку партыйных нізавых ячэек наяўны і гэта мае сваім вынікам палепшаньне стану гэтае галіны працы. Асноўнай формай, праз якую праводзіцца праца сярод рабоча-сялянскай жаночай масы, гэта дэлегацкі сход. І таму ў залежнасьці ад таго, як пастаўлена праца ў дэлегацкім сходзе, наколькі ён выконвае сваю задачу грамадзкай школы, наколькі добра дэлегаткі-ўдзельніцы сходаў зьвязаны з практычнай працай савецкіх і грамадзкіх арганізацый, можна судзіць аб стане працы сярод працоўных жанчын наогул.

Амаль паўгода, што прайшло ад пачатку сталай працы дэлегацкіх сходаў, даюць магчымасьць ужо цяпер зрабіць некаторыя абагульненьні. Кампанія перавыбараў дэлегацкіх сходаў, якая адбывалася пад лёзунгамі растлумачэньня чарговых задач партыі і савецкай улады шырокім масам жанчын, уцягненьня іх да ўдзелу ва ўсіх відах сацыялістычнага будаўніцтва, праходзіла пры значна большай і льпшай арганізацыі гэтае справы як з боку партячэек, так і раённых і акруговых камітэтаў партыі. А адначасова праведзеная кампанія паказала значна ўзрослую актыўнасьць жанчын, што выявілася ў першую чаргу ў павялічэньні процанту наведваньня перавыбарчых сходаў жанчынамі (у сярэднім—горад 53,5 проц., у вёсцы - 47,8 проц.).

У выніку перавыбараў дэлегацкіх сходаў у 1927-28 г. мы маем некаторае павялічэньне сеткі дэлегацкіх сходаў (на 15 проц.) пры стабільнай колькасьці ліку дэлегатак (27.767 летась і 27.900 сёлета). Такое зьявішча дае магчымасьць яшчэ лепш абслужыць дэлегатку-сялянку таму, што сход, набліжаючыся бліжэй да кожнай вёскі, больш мае гарантыі на пасьпяховае наведваньне.

Амаль цалком не зьмяніўся і сацыяльны склад дэлегатак, даючы некаторае павышэньне колькасьці батрачак (з 3,5 проц. да 6,4 проц.).

Пераходзячы да працы дэлегацкіх сходаў, неабходна адзначыць, што ўсё-ж яшчэ недахопы леташняй працы цалкам ня зьнішчаны. Слабая ўвязка праграмных пытаньняў з практычнай працай мясцовых савецкіх і грамадзкіх арганізацый, безадказнасьць у працы з боку асобных прапапагандыстых-кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў, слабы ўдзел дэлегатак-батрачак і бяднячак на сходах беднаты, спазьненьне з прымацаваньнем дэлегатак да практыкаваньня ў арганізацыях, няма ўвязкі дэлегацкіх сходаў саўгасаў з саюзам працземлес і г. д.—усё яшчэ маюць месца, ня зжыты.

А галоўнае—гэта культурніцкі ўхіл у сходах працы, які мае месца. Партарганізацыі павінны зьвярнуць больш увагі на выкарыстаньне гэтых недахопаў, надаўшы працы сходаў практычна-канкрэтны характар. Нарада жанаддзелаў гэта пытаньне павінна завастрыць і ўсебакова распрацаваць шляхі далейшай працы.

І другое пытаньне гэта становішча і далейшая праца з жаночым актывам. Ня гледзячы на даволі значны колькасны яго ўзрост і ва ўсіх галінах (прафактыў—6.376 асоб, у гарадзкіх саветах павялічэньне на 2,5 проц. і г. д.), праца з ім пастаўлена ўсё яшчэ слаба. У практычную працу гарсаветаў жанчыны члены саветаў уцягваюцца ня ўсе і ня ўсюды, слаба абстаіць справа з вылучэньнем жаночага актыву на кіруючую працу, маюць месца ня зусім добрыя адносіны да вылучаемых, нярэдкі выпадкі нядбайных адносін да жанчын-актывістак з боку нізавых арганізацый, у сэнсе аказаньня ім дапамогі ў працы і г. д.

Неабходна выконваць дырэктывы партыйных і савецкіх органаў у частцы ўцягненьня ўсіх абраных у практычную працу—прыцягваньне іх да справаздачных кампаній выконваць у поўнай меры і павялічыць вылучэньне работніц і сялянак па кіруючую савецкую працу.

Адначасова ўсім партарганізацыям трэба ва ўсю шырыню паставіць пытаньне аб рацыянальным выкарыстаньні жаночага актыву, не перагружаючы яго непасільнай працай, ад якое церпіць праца, і што адбіваецца на яе якасьці.

І правільная, болей глыбокая і канкрэтная па зьместе пастаноўка масавай працы, шырокае папулярызаваньне пастаноў XV партыйнага зьезду зьяўляецца чарговай задачай нашых партарганізацый.

Пытаньні гэтыя пастаўлены на абгаварэньне працаўнікоў, найбольш блізка зьвязаных з працай сярод жанчын—задача ўсёй партыі кожнага партыйца праводзіць іх у жыцьцё.

Практыка работы груп беднаты

(Ветрынскі раён, Полаччына)

Да арганізацыі груп беднаты ў раёне наша партарганізацыя прыступіла ў маі 1927 году і ў сучасны момант мы маем у раёне 11 груп.

Каб прасачыць, як працавалі групы беднаты, возьмем для прыкладу Ветрынскую групу, арганізаваную пры сельсавеце. Гэта група на сваіх сходах разглядала пытаньні, як—задачы партыі ў адносінах да беднаты, інструктаваньня членаў групы, разьмеркаваньня ільготнага фонду па страхаваньні, разьмеркаваньня лесу сярод беднаты і малазаможнага сялянства, разьмеркаваньня ільготнага фонду па сельска-гаспадарчым падатку, складаньня сьпісаў незаможных гаспадароў і прадстаўленьня іх да звальненьня ад падатку згодна маніфэсту ЦВК СССР.

Аналёгічныя пытаньні разглядаліся і ў другіх групах.

Праўда, групы, арганізаваныя пры каапэрацыі, больш разглядалі пытаньні каапэраваньня беднаты, асабліва іх праца выявілася ў часе перавыбарчай кампаніі, дзе групы бралі ўдзел у падборы кандыдатур у склад новых праўленьняў, рэвіз. і крамныя камісіі.

Там-жа, дзе пры каапэрацыі ня было груп беднаты, у часе перавыбараў скаліся яны з складу ўпоўнаважаных беднякоў. На такіх сходах абгаворваліся пытаньні аб адлічэньні сродкаў у фонд беднаты. Трэба сказаць, што ва ўсіх выпадках пастановы груп праходзілі на 99 проц.

Аднак, такія пытаньні, як арганізацыя машынных таварыстваў, арцеляй, земляўпарадкаваньне, крэдыты вельмі часта праходзяць без належнае ўвагі на іх з боку груп беднаты і ячэек КП(б)Б. У гэтым, і толькі ў гэтым, адзін з недахопаў нашай працы з беднатою.

Ня зусім добра абстаіць справа і з крэдытаваньнем беднаты, а таксама і з задаваленьнем беднаты машынамі і земляўпарадкаваньнем. У далейшай працы груп беднаты прыдзецца асабліва зьвярнуць увагу на гэтыя пытаньні.

Бесплянавасьць працы сельсаветаў не дае магчымасьці бядняцкім групам падрыхтаваць тыя ці іншыя пытаньні для вырашэньня іх на прэзыдыуме ці пленуме сельсаветаў. Пляны па земляўпарадкаваньні павінны быць ня толькі ў р йземкамісіі, але і ў тых сельсаветах, у якіх у бліжэйшыя гады яно намячаецца.

П. Вараб'ёў.

Па ячэйках КП(б)Б

Міхалкаўская партячэйка (Мазырская акр.) невялікая: налічвае ў сваім складзе 3 члены і 5 кандыдатаў партыі. Праца не за апошнія 2 месяцы значна палепшылася: падбіраюцца цікавыя пытаньні да адкрытых пар тсходаў, шырока разгортваецца праца з беднатою і агульна-масавая сярод сялянства.

За вышоўшыя 2 месяцы ў ячэйку паступіла 7 заяў ад порадавых сялян аб прыёме іх у партыю.

Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву ячэйкі, палепшаюць сваю працу сельскія ўстановы і арганізацыі.

П. Гарбацэвіч.

У ячэйку КП(б)Б фабрыкі „Спартак" (гор. Шклоў, Маг. акр.) падана 34 заявы ад рабочых і служачых аб прыёме іх у партыю, у сувязі з кастрычніковым заклікам. З агульнага ліку падаўшых заявы ёсьць 7 работніц.

24 чалавекі, з агульнага ліку, рабочыя ад варштату, 6 чалавек таксама рабочыя, якія працуюць на падсобных работах (грузчыкі і др.) і толькі пазначная частка служачых фабрыкі.

Партячэйкай фабрыкі ўжо аформлена 27 чалавек, іншыя заявы знаходзяцца ў стадыі афармленьня.

Заявы ў ячэйку яшчэ паступаюць.

Іпатаў.

Агульны сход ячэйкі КП(б)Б пры Рагачэўскім лесапільным заводзе (Бабруйская акруга), які адбыўся 12 студзеня, заслухаў даклад фракцыі фабзаўмясцкому. Выступаючыя ў спрэчках партыйны і прысутныя беспартыйныя зазначылі, што фракцыя фабзаўкому і ўвесь фабзаўком павінны глыбей увікаць у сваю працу, больш удзельнічаць у справе рацыяналізацыі прадпрыемства.

Г. Мейцін.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Міжгародні шахматны матч--турнір у Магілеве

14-га і 15-га студзеня ў Магілеве адбыўся шахматны матч-турнір паміж Віцебскам, Магілевам, Гомелем і Клімавічамі. Прафсаюзы кожнага з гэтых гарадоў вылучылі па 5 ігракоў. Матч выклікаў вялізарную зацікаўленасьць з боку рабочых і служачых. Вынікі матчу дае наступная табліца:

№№	Гарады	1	2	3	4	месца
1	Віцебск		2½	4	5	1 і 2-е
2	Гомель	2½		4	5	1 і 2-е
3	Магілеў	1	1		2	3-е
4	Клімавічы	0	0	3		4-е

Усебеларускія шахматныя і шашачныя спаборніцтвы наманд адбудуцца ў сакавіку. Тыя ігракі, якія атрымаюць першую катэгорыю, будуць прыняты ў чэмпіянат Беларусі.

Выраб беларускай фанэры

МАЗЫР. (Уласны кар.). На фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» у першым квартале 1927-28 апэрацыйнага году выхад экспартнай фанэры выявіўся ў наступным: у кастрычніку месяцы выпрацавана 14 вагонаў экспартнай фанэры, у лістападзе—8 ваганаў і ў сьнежні 14 вагонаў.

Хістаньні і наогул невыстарчальнасьць выробу экспартнае фанэры тлумачыцца радам прычын, напрыклад: слабасьць працы парыльных камэр, сапсаванасьць аднаго прэсу і неўрэгуляванасьць работы 3-й зьмены.

Гэтае пытаньне абгаворвалася на партыйнай ячэйцы, таксама на заводзкім камітэце. Зараз прымаюцца неабходныя мерапрыемствы, каб павялічыць выраб экспартнай фанэры.

Б. Ш.

11 новых мастоў

Мазыр. (Уласны кар.). У Нараўлянскім раёне праароблена за 1926-27 гаспадарчы год наступная будаўнічая работа: пабудавана 7 новых мастоў раённага значэньня працягам на 45-36 мэтраў на суму 1.047 р., адрамантавана грэбель працягам на 2.645,28 мэтраў, пабудаваны 4 новыя масты сельскага значэньня, працягам 8,52 мэтры, і адрамантаваны 3 масты і 5 грэбель. На ўсё гэтае будаўніцтва затрачана бюджэтных сродкаў 1.297 рублёў і сродкаў насельніцтва 1.898 рублёў.

Апрача гэтай работы праведзена яшчэ наступнае будаўніцтва: пабудован народны дом, 2 новыя будынкі пад школы, закладзен фундамант на пабудову новага будынку пад школу ў в. Аляксандраўцы, адрамантавана 8 школьных будынкаў, адна хата-чытальня і адзін камунальны будынак.

Б. Ш.

Ліквідаваць няпісьменнасьць батрацтва

(Спуцкі раён)

Нядаўна адбылася раённая канфэрэнцыя батракоў. На канфэрэнцыю зьявіўся 41 дэлегат.

Канфэрэнцыя выявіла значны ўзрост актыўнасьці батрацтва: было задана па кожным дакладзе да 20 пытаньняў, амаль палова дэлегатаў выступала ў спрэчках.

Асаблівую ўвагу зьвярнула канфэрэнцыя на культурнае абслугоўваньне батрацтва. Прамоўцы спыняліся, галоўным чынам, на неабходнасьці поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці.

— «На сходах,—гаварылі батракі,—мы адчуваем сябе яшчэ дрэнна, бо мы яшчэ цёмныя, ня можам добра гаварыць, з нас сьмяюцца». Таму «неабходна больш батракоў пасылаць на рабфакі і падрыхтоўваць іх да гэтага».

Асаблівую зацікаўленасьць канфэрэнцыі выклікала выступленьне батрачкі, якая ў сучасны момант займаецца на рабфаку і якая адзначыла клопаты партыі аб батраку.

Я.

Посьпех БДТ-І у Віцебску

ВІЦЕБСК. (Уласны. кар.) Беларускі тэатр карыстаецца вялізарным посьпехам у шырокіх працоўных мас Віцебшчыны. З прычыны таго, што тэрмін прабываньня тэатру ў Віцебску хутка закончыцца, прэзыдыум АСПС узьняў праз ЦОПСБ хадайніцтва перад Наркамасьветы Беларусі аб тым, каб Беларускі тэатр пабыў ў Віцебску яшчэ адзін месяц.

Нашы хаты-чытальні

На працягу апошніх год галоўная ўвага зьвярталася на правядзеньне палітыка-асьветнай работы ў вёсцы. Асноўнаю палітыка-асьветнаю ўстановаю ў вёсцы зьяўляецца народны дом і хата-чытальня. Становішча іх пакуль што яшчэ нездавальняючае ў сэнсе іх абсталяваньня. Яны зьмяшчаюцца ў дамох часта разам з сельсаветамі або ў прыватных сялянскіх хатах і ў царкоўных дамох. Толькі 45 проц. хат-чытален маюць асобныя ўласныя памяшканьні, а 12 проц. іх знаходзяцца ў адным памяшканьні з сельсаветамі, у сялянскіх хатах зьмяшчаецца 43 проц. хат-чытален. Бібліятэкі народных дамоў і хат-чытален бедныя. Кнігі амаль усе без пераплётаў, а таму хутка зношваюцца. Работа хат-чытален абцяжарваецца тым, што ў саветы хат-чытален яшчэ невыстарчальна ўцягнуты актыў сялянства, а таксама нездавальняючы склад кіраўнікоў, якія часта пераводзяцца з аднаго месца ў другое, што таксама адбіваецца на рабоце хат-чытален. За апошнія 2 гады прапушчана праз курсы перападрыхтоўкі 360 кіраўнікоў. Перападрыхтоўка іх праводзіцца ў Віцебску, Менску і Магілеве.

Але, ня гледзячы на радняспрыяючых умоў, хаты-чытальні ўсё больш і больш робяцца папулярнымі. Сяляне па ўласнай ініцыятыве часта адкрываюць хаты-чытальні і чырвоныя куткі, а ў большасьці гэтай ініцыятыве сялянства дапамагаюць рабочыя шэфы. Сярэдняе наведваньне хаты-чытальні 25-40 чалавек, народных дамоў—60 чалавек, з іх большы процант моладзі, але таксама наглядаецца і павялічэньне наведваньня дарослых, якое ў некаторых мясцох дасягае да 50 проц. усяго наведваньня хаты-чытальні.

Для абслугоўваньня хатамі-чытальнямі нацыянальных меншасьцяй у 1926-27 годзе існавала 23 польскія, 15 яўрэйскіх 4 латыскія хаты-чытальні. У некаторых хатах-чытальнях арганізуюцца гурткі на мовах нацыянальных меншасьцяй.

Як Беларусь рыхтуецца да 10-годзьдзя Чырвонай арміі

Акруговая камісія БВА арганізуе акруговую выстаўку пры Смаленскім Доме Чырвонай арміі. На выстаўцы будуць аддзелы: гісторыя Чырвонай арміі, гісторыя часьцей акругі, справа абароны і савецкая грамадзкасьць і г. д.

Асаблівую ўвагу камісія зварочвае на правядзеньне сьвята на вёсны. З гэтай мэтай ва ўсе даклады і інсэніроўкі ўводзіцца так званы «вясковы варыянт».

У самы дзень сьвяткаваньня пры ўдзеле вайсковых часьцей і Асавіяхіму будуць праведзены паказальныя баявыя інсэніроўкі.

У Віцебску загадам па гарнізоне ў часьцях Чырвонай арміі створаны сэкцыі па падрыхтоўцы да дзесяцігодзьдзя Чырвонай арміі: 1) сэкцыя сьвяткаваньня ў ленінскім кутку; 2) сэкцыя сьвяткаваньня ў клюбе; 3) сэкцыя масавых дзеяньняў у горадзе; 4) сэкцыя выставак кніг аб Чырвонай арміі; 5) сэкцыя гаспадарча фінансавая і арганізацыйная і 6) сэкцыя агітпрапагандысцкая і літвыдавецкая.

Газэта «Заря Запада» на сваіх старонках пачала агляд работ ячэек Асоавіяхіму-да дзесяцігодзьдзя Чырвонай арміі. Лепшым ячэйкам будуць выданы прэміі ад 70 да 13 руб.

У Магілеве створана акруговая камісія, якая распрацавала плян падрыхтоўкі і пачала праводзіць яго ў жыцьцё.

Газэта «Магілеўскі Селянін» праводзіць агляд работ ячэек Асоавіяхіму і гурткоў вайсковых ведаў.

У Бабруйску. Бабруйская газэта «Камуніст» абвясьціла конкурс на лепшую ячэйку Асоавіяхіму. Конкурс ставіць сабе мэтаю высьвятліць дасягненьні і недахопы ў рабоце ячэек Асоавіяхіму. Лепшая ячэйка атрымлівае прэмію—вайсковы куток.

ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва рыхтуецца да культурнага абслугоўваньня ў дзень 10-годзьдзя Чырвонай арміі ўсіх гарнізонаў. З 10-гадовым юбілеем Чырвонай арміі супадае пяцігадовы юбілей саюзу працаўнікоў мастацтва, што і будзе ўвязана з юбілеем Чырвонай арміі.

Саюз працасьветы сьпіць.

— У нас плян будзе праз тыдзень,—адказалі працаўнікі саюзу працасьветы. А сьвяткаваньне 10-годзьдзя Чырвонай арміі на носе. Так, браточкі, праз тыдзень... зьбіромся адсьвяткаваць 10-годзьдзе Чырвонай арміі...

Камісарыят асьветы разаслаў усім акругам дырэктывы адносна сьвяткаваньня на школах 10-годзьдзя Чырвонае арміі.

Пры правядзеньні гэтага сьвята будзе зьвернута асаблівая ўвага на высьвятленьне ў часе школьных заняткаў гісторыі Чырвонае арміі, яе барацьбы за ўладу саветаў і ў прыватнасьці за Савецкую Беларусь.

Будзе зьвернута таксама ўвага на неабходнасьць папаўненьня школьных бібліятэк вайсковай літаратурай. Па школах будуць наладжаны ранішнікі і школьныя вечары сумесна з прадстаўнікамі Чырвонае арміі.

СКУРАНЫЯ І МЯСНЫЯ ЗАГАТОЎКІ

Што перашкаджае загатоўцы скурсырцу

Кіраўнікі беларускага аддзялення Скурсындыкату ў гутарцы з супрацоўнікам нашае газэты заявілі:

Загатоўка скуранога сырцу на Беларусі ў гэтым годзе працякае далёка незадавальняюча.

Паказальнікам гэтага зьяўляюцца лічбы выканаўня загатоўчага плану. За першы квартал плян Наркамгандлю выкананы па Беларусі на буйным сырцы на 67,7 проц., на дробным—на 78,5 проц. Загатоўка буйнога сырцу складае 62.300 шт. пры пляне ў 92.000, дробнага сырцу—74.600 шт. пры пляне 95.000.

Якія прычыны гэтага?

У гэтым годзе, з прычыны добрай ураджайнасьці, сялянства ўстрымлівалася ад выкідваньня жывёлы на рынак і імкнулася да адраджэньня сваёй жывёлы, якое зьменшылася ад забою ў мінулым годзе, калі адсутнічалі кармавыя травы. З прычыны гэтага мы маем зьмяншэньне забою па ўсіх бойнях БССР на 20 проц., што зьмяншае таксама і збор сырцу.

Пабывалая напружанасьць скуранога сырц вага рынку ў БССР тлумачыцца, з аднаго боку, інтэнсыўнай канкурэнцыяй прыватніка, з другога—да гэтага часу ня ўладжанымі ўзаемаадносінамі паміж асобнымі загатоўшчыкамі сырцу.

Канкурэнцыя прыватніка па скураным сырцы рэзка завастрылася ў гэтым годзе, у выніку недахопу скураных тавараў і высокіх цен на іх у прыватным гандлі.

Па даных Скурсындыкату ў першым квартале прыватнік-скупшчык плаціў за сырэц на 80-90 проц., а на некаторых відах на 150 проц. даражэй, чым дзяржаўныя загатоўшчыкі. Зразумела, пры такім становішчы дзяржаўныя загатоўшчыкі ня могуць канкураваць з прыватнымі загатоўшчыкамі сырцу.

Момантам, ускладняючым загатоўчую работу, зьяўляецца таксама неналаджанасьць узаемаадносін паміж асобнымі выступаючымі на рынку дзяржзагатоўшчыкамі.

Да пачатку гэтага году Наркамгандаль зацьвердзіў загатоўшчыкамі па скураным сырцы апараты Скурсындыкату, спажывецкай і с.-г. кааперацыі. Для таго, каб уніканць тузаньня загатоўчага апарату, Наркамгандаль зацьверлзіў канчатковы сьпіс загатоўчых пунктаў для кожнага з гэтых загатоўшчыкаў.

Ня гледзячы на гэта, спрэчкі паміж асобнымі загатоўшчыкамі ня спыняюцца.

Якасьць работы с.-г. сыстэмы па скурсырцовых загатоўках далёка нездавальняючая. Загатоўчы плян Наркамгандалю выкананы с.-г. сыстэлай па буйным сырцы на 39 проц., а на дробным сырцы—на 56 проц.

Дагэтуль адзначаецца ненармальнасьць у мэтадах працы асобных загатоўчых ячэек. Рад кааперацыйных нізовак выкарыстоўвае ў працы прасолаў — прыватных скупшчыкаў сырцу. Выкарыстоўваньне прыватнікам кааперацыі часта даходзіць да абсурду. Напрыклад, пры абсьледваньні скураных загатовак прадстаўнік Наркамгандлю высьвятліў, што ў Лоеве, Гомельскай акругі, скупшчык с.-г. таварыства працуе на ўмовах атрыманьня 60 проц. ад прыбытку таварыства па загатоўцы скуранога сырцу. Аналёгічнае становішча існуе на іншых раёнах.

Праведзеныя мерапрыемствы па выцясьненьні прыватніка з сырцовага рынку бязумоўна ўнясуць спакой на рынку. Пералом ужо адчуваецца. Да дзяржаўных загатоўшчыкаў ужо пачаў паступаць рынкавы сырэц, які раней амаль цалком быў у руках прыватніка.

Асабліва гэта наглядаецца на паступленьні каніны, якая пачала загатаўляцца па ўсіх раёнах, ня гледзячы на скончэньне сэзону.

Мерапрыемствы па абмяжоўваньні прыватніка аказаліся своячасовымі і ў адносінах загатоўкі апоек.

Калі прыведзеныя мерапрыемствы будуць пагыблены і ўзмоцнены, то можна быць упэўненым, што плян па апойку і па буйным сырцы будзе выкананы.

ХОД МЯСАЗАГАТОВАК НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ

У Белмясгандлі нашаму супрацоўніку паведамілі наступнае:

Агульны ход загатовак па выкананьні нашага пляну нездавальняючы. Прычыны—павялічэньне пляну і позьняе паступленьне крэдытаў. Так, 100.000 руб., якія былі нам адпушчаны, паступілі ў канцы першага кварталу і гэта адбілася на нашых мясазагатоўках.

Прапанова жывёлы ў гэтым годзе дастатковая, але цэны рэзка вазыходзяцца.

Слабая загатоўка вызвана таксама недахопамі нашага апарату і вялікай колькасьцю загатоўшчыкаў, што адбіваецца на працы. Найбольш слаба ідуць загатоўкі па Віцебску і Гомелю. Гэта тлумачыцца ненарыхтаванасьцю апарату (апарат складаўся з учарашняга прыватніка, сёньнешняга загатоўшчыка) і слабасьцю загатоўшчыкаў.

Дагэтуль у справе мясазагатовак вялікай перашкодай былі прыватнікі, якія загатаўлялі вялікія партыі жывёлы для Ленінграду і Масквы.

У апошні час, дзякуючы прадпрынятым мерам, прыватнік выцясьняецца з мясазагатоўчага рынку. За першы квартал загатоўлена па БССР 1.450 тон, што складае 50 проц. пляну. Пры паглыбленьні і ўзмацненьні мер па выцясьненьні прыватніка, можна лічыць, што плян па мясазагатоўках будзе намі поўнасьцю выкананы.

Загатоўкі ўзмацняюцца

Згодна вестак, атрыманых Белкапсаюзам з Слуцку, становішча на Слуцкім раёне малюецца ў наступным выглядзе:

Адна ныя прапаўнікі аддзяленьня Белкаапсаюзу абяжджаюць спажывецкія таварыствы і інструктуюць іх па ўсіх пытаньнях загатовак.

Пушніны, ануч, шчаціны, конскага волосу і скуранога сырцу загатоўлена за другую дэкаду на суму звыш 20.000 р., што дае павялічэньне супроць першай дэкады на 80 проц.

Што датычыць загатоўкі на мясцох у гэты час, то пакуль паступілі весткі ад 8 спажывецкіх таварыстваў, якія загатовілі звыш 68.000 кілёграмаў збожжа прадуктаў.

У САЎНАРКОМЕ БССР

Палепшаньне становішча раённых спэцыялістых сельскай і лясной гаспадаркі

(Пастановы)

Раённы агранамічны, ветэрынарны, лясны персанал і спэцыялістыя дасьледчых станцый, тэхнікі на сельскім будаўніцтве забясьпечваюцца бясплатнымі кватэрамі або патрэбнымі па бюджэце сродкамі на наём кватэры, транспартнымі сродкамі для службовых разьездаў, а таксама спэцпапраткай. За работу ў сельскіх мясцовасьцях і на адным месцы для раённых спэцыялістых устанаўляецца пэрыядычная прыбаўка праз 3 гады службы ў раёне ў межах БССР у разьмеры ад 5 да 15 проц. іх заработку. Такія прыбаўкі робяцца ня больш 3-х раз.

З мэтаю павялічэньня кваліфікацыі спэцыялістых па каштарысе НК Земляробства прадугледжваюцца патрэбныя сродкі на праязьдзеньне курсаў, на камплектаваньне бібліятэк, а таксама павінны практыкавацца камандыроўкі лепш падрыхтаваных спэцыялістых у Беларускую Сельска-Гаспадарчую Акадэмію. Пачынаючы з 1927-28 г. ня менш, як 10 проц. складу зазначаных раённых спэцыялістых павінны даваць навуковыя камандыроўкі тэрмінам да 3-х месяцаў за кошт НК Земляробства з захаваньнем за камандыруемымі іх зарплаты і кватэр як у межах СССР, так і за граніцу. Устанавяецца прэміяльны фонд для прэміраваньня асобных дасягненьняў спэцыялістых. Выканаўчыя камітэты павінны ўключыць у выдатковыя часткі бюджэтаў патрэбныя сродкі для забясьпячэньня спэцыяльнага пэрсаналу, які запрашаецць на працу ў раён (надзёмныя і інш.).

Для канчатковай рэдакцыі пастановы СНК па гэтым пытаньні, а таксама для разьбіўкі раённых спэцыялістых па катэгорыі з адпаведным проц. прыбаўкі складзена камісія, якой даручана падаць зрэдагаваны праект пастановы на подпіс старшыні СНК.

Абслугоўваньне ясьлямі работніц прамысловых прадпрыемстваў

На арганізацыю і ўтрыманьне ясьляй для дзяцей работніц, занятых на вытворчасьці, адлічэнца ад 5 да 10 проц. фонду на палепшэньні быту рабочых. З 1-га студзеня 1928 г. устанаўляецца ўдзел прадпрыемстваў на асобным сьпісе ў выдатках на ўтрыманьне ясьляй, абслугоўваючых выключна работніц гэтага прадпрыемства, у разьмеры адна з чвэрт. фонду заработнай платы гэтага прадпрыемства, незалежна ад таго, ці знаходзяцца ясьлі на тэрыторыі прадпрыемства, ці па-за прадпрыемствам.

Акруговым выканаўчым камітэтам заапрапануецца пры зацьвердзеньні каштарысу мясцовых органаў аховы здароўя прадугледжваць сыстэматычнае павялічэньне сродкаў, якія асігноўваюцца на арганізацыю, утрыманьне і будаўніцтва ясьляй для дзяцей рабочых. Дзяржаўныя установы і прадпрыемствы, а таксама кааперацыйныя арганізацыі павінны прадугледжваць пры будаўніцтве рабочых кватэр і пасёлкаў набудоўку памяшканьняў для ясьляй з тым, каб, пачынаючы з будаўнічага сэзону 1928-9 г., началі выконваць адпаведныя будаўнічыя пляны. НК Аховы Здароўя запрапанавана асігнаваць сродкі на пабудову новых ясьляй з рэспубліканскага фонду малацынскай дапамогі застрахаваным.

Аб скліканьні нарады акруговых інспэктароў нарасьветы

Савет Народных Камісараў задаволіў хадайніцтва НК Асьветы аб скліканьні на 5-6 лютага г. г. нарады акруговых інспэктароў народнай асьветы.

Дзяржаўны мінімум зарплаты

Савет Народных Камісараў пастанавіў устанавіць на кастрычнік 1927 г.—сакавік 1928 г. мінімальную зарплату па паясох у наступным разьмеры: г. г. Менск, Віцебск, Гомель—другі пояс, а іншыя мясцовасьці БССР—трэці пояс.

Першая партыя аблігацый

Наркамфін атрымаў з Масквы першую партыю аблігацый сялянскай пазыкі на суму да 100.000 р. Усе аблігацыі разьмеркаваны па акругах. Паводле вестак, атрыманых у НКФ, арганізацыйная праца ў акругах Беларусі па рэалізацыі пазыкі скончана. Усе неабходныя матар'ялы мясцом разасланы.

БЯЗМОЗГЛАЯ ЭКАНОМІЯ І ДЗЮРАВЫЯ КІШЭНІ

◆ Менскі Эльвод эканоміць грашы, а траціць рублі. ◆ Мазырскі Камгас ня ведае, што ў яго пад носам робіцца. ◆ Штаты Барысаўскай пошты растуць, як грыбы. ◆ За здорава жывеш раздалі 20 тысяч

Дырэктывы—пад сукном, а штат разбухае

Тры месяцы назад пранеслася над паштовым аддзяленьнем г. Барысава нейкая рацыяналізацыя. З боку вышэйшых установаў было прапанавана скараціць штат Барысаўскага аддзяленьня на палову. З другога боку Барысаўская акруга ліквідалася, праца значна зьменшылася.

Ня гледзячы на ўсе прапановы, штат у сучасны момант пачаў зноў расьці.

Так, напрыклад, Нова-Барысаўскае аддзяленьне сувязі абслугоўвае ўсяго толькі 23 чалавекі, а ў Барысаве чамусьці—40.

На прыёме пасылак у Нова-Барысаве сядзіць адзін чалавек, а працы ў аддзеле значна больш, чым у Барысаве, у апошнім-жа працуе на гэтым аддзеле 4 чалавекі, якія ня маюць поўнай нагрузкі.

Загадчык заказнога аддзелу ў Барысаве атрымлівае пэнсію па 10-м разрадзе, а працуе ў дзень ня больш 3-х гадзін. Акрамя яго сядзіць на гэтым аддзеле яшчэ адзін працаўнік, які працуе за загадчыка. Калі хто кажа загадчыку паштовага аддзял., што ў яго ёсьць лішнія працаўнікі, дык ён гаворыць, што аддзяленьне дае прыбытку 4000 р. у месяц, а таму можа дазволіць сабе «роскошь» трымаць разбухшы штат. У сучасны момант на працу прыняты новыя два чалавекі. Быў у нас і «рэвізор», але не зьвярнуў на гэту справу ўвагі, ня выслухаў працаўнікоў.

Вось як праводзіцца рэжым эканоміі і рацыяналізацыя апарату ў нашым аддзяленьні сувязі.

А. Станкевіч.

„Рэжым дыбам"

(Эльвод)

Суровы рэжым эканоміі праводзіць адміністрацыя Менскага Эльводу. Вам патрэбен аловак або пяро, або два лісты паперы. Вы думаеце, што адміністрацыя Эльводу адразу адпусьціць? Не такі ўжо наш дырэктар безгаспадарнік, каб раскідвацца маемасьцю.

Равей за ўсё траба скласьці запатрабаваньне на канцылярскія прылады, адзначыць, колькі і на які тэрмін вы патрабуеце алоўкаў, узмацніць запатрабаваньне подпісам і адпаведным нумарам.

Што-ж вы думаеце, пасьля гэтага вам адпусьцяць? Нічога падобнага. Сакратар дырэктара запытае ў вас: ці далі справаздачу вы за стары аловак, ці не перавысілі вы норму, ці не зрабілі перавыдатку? Далей сам Багамолаў урэжа чырвоным арнамэнтам вашы запатрабаваньні. Такім чынам у адным будаўнічым цэху за месяц з'эканомілі 1 руб. 47 кап., а цэхаў у нас 5. Вось вам і 7 руб. 35 кап! Няўжо-ж гэта ня рэжым эканоміі?

Вы выкліканы істцом па справе аб парушэньні калдагавору ў працоўную сэсію. Што-ж робіць адміністрацыя? Яна адлічвае за дзень, які вы правялі па судзе.

Няўжо-ж і гэта ня рэжым эканоміі? Такім чынам можна з'эканоміць 8-10 р. у месяц.

А вось вам і «рэжым» навыварат. Колькі трэба затраціць грошай для таго, каб адрамантаваць пліту і пакласьці 40 шт. цэглы.

Вылічыць ня цяжка. Два дні працы, 5 руб. 74 кап. за работу і 6 руб. 08 кап. за матар'ялы. Ці ведаеце вы, колькі ў сапраўднасьці заплачана?—48 руб. 41 кап. Больш у чатыры разы, чым павінна быць!

Работа на разрадзе № 10—пабудова стулні цягнецца ад 27-га ліпеня і ўжо каштуе 2.421 р. Работа зацягнулася да зімы, а яе можна было скончыць на працягу месяцаў двух.

Эканомяць на капейках, а траціць рублі!

Рабочы.

Дарэмная трата грошай

4 інструктары **Днепрасаюзу** абслугоўваюць спажывецкія таварыства былой Калініншчыны. Калі яны прыяжджаюць у аддзел саюзу ў Воршу, ім лічаць гэты прыезд, як камандыроўку, аплачваюць сутачныя і кватэру на тэй падставе, што кватэры іх, быццам находзяцца ў Клімавічах. У сапраўднасьці яны жывуць у Воршы.

Інструктары ў сваёй працы непасрэдна зьвязаны з аргаддзелам саюзу. Прыезды іх у Воршу вельмі часты, а кожны прыезд, згодна справаздач, каштуе некалькі сот рублёў.

Гэта зьявішча ненармальнае. У далейшым траба спыніць выкідваньне значных сум грамадзкіх грошай. Няхай кватэры інструктароў лічацца ў Воршы!

Каапэратар.

20 тысяч безнадзейных даўгоў

На працягу раду гадоў Мазырскі інспэктарыят нарасьветы раздаў шмат бюджэтных грошай авансамі розным асобам і ўстановам. Ня прымаецца ніякіх мер да спагнаньня гэтых грошай, да звароту іх у касу Наркамфіну. Да канца 1927 г. па інспэктарыяце лічыцца 20.222 р. неапраўданых авансаў: з іх ад 1923-24 г.—307 р., 1924-25 г.—6.734 рублі, 1925-26 г.—609 р., 1926-27 г.—12.572 р. Што зрабіў інспэктарыят? Па яго хадайніцтве, прэзыдыум АВК сьпісаў 843 р., як безнадзейныя да звароту. А што будзе з рэштай авансаў?

Інспэктарыят нарасьветы, акрамя таго, выдаў аддзелу аховы здароўя 2.300 р. бюджэтных грошай на пабудову дзіцячай калёніі. **Аддзел аховы здароўя, замест калёніі, пусьціў гэтыя грошы ў зваротны капітал магазыну дзіцячай камісіі.**

8.000 р. былі выданы камунальнаму трэсту на пабудову клюбу піянэраў ня ніча за доўга да пачатку будаўніцтва—8.000 р. некалькі месяцаў круціліся ў кішэнях розных арганізацый.

Належала-б пракурору зацікавіцца парадкамі ў Мазырскім інспэктарыяце нарасьветы. Многа цікавага знайшоў-бы ён у грашовых справах.

З.

Рабочае вока

— Адміністрацыя гуты імя Домбаля (Нова-Барысаў) вельмі любіць панярэвую цяганіну. Кожны дзень кожны загадчык цэху атрымлівае 5, а то і больш паперак, на якія патрабуецца адказ. Гэтыя паперкі адрываюць час ад асноўнай працы загадчыка. На пасяджэньнях РКК ніяк нельга прысьці да згоды. У мінулым сэзоне было 100 канфліктаў. Цяпер за два месяцы работы ўжо ў два разы больш.

Б. Ц.

— У мінулым годзе да трасільных машын на запалкавай фабрыцы „Чырвоная Барэзіна" былі пастаўлены дзьве вучаніцы. Апошнія прапрацавалі па два тыдні і вытрымалі іспыты, але за адсутнасьцю месц яны былі пераведзены на іншую працу з тэй ўмовай, што калі будуць месцы, яны зноў будуць працаваць пры машыне. Нядаўна адна старая работніца звольнілася і засталося вольнае месца, але адміністрацыя ня выклікала свайго абяцаньня і не паставіла вучаніцу да машыны.

А. Г.

— Заўкомы заводаў імя Домбаля, „Камінтэрн", „Рабочы" і „Чырвоная Барэзіна" выпісваюць гадзеты рабочым праз паштавое аддзяленьне, але чамусьці яны не заплацілі аддзяленьню за падпіску. За імі лічыцца вялікая заваргванасьць.

А. С.

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ

НІВОДНАГА СЕЛЯНІНА БЕЗ АБЛІГАЦЫІ

Пачалі рэалізацыю

МАГІЛЕЎ. (Уласны кар.). Акруговымі ўстановамі ўжо пачата падрыхтоўка да рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі. Складзена акруговая камісія з прадстаўнікоў акрвыканкому, акружкому партыі, акрпрафсавету, фінадзелу і земадзелу. Па раёне таксама арганізуюцца камісіі, у склад якіх увойдуць прадстаўнікі розных арганізацый.

Для індывідуальнай прапаганды намечана скарыстаць усіх савецкіх прапаўнікоў вёскі, настаўнікаў, аграномаў, а таксама камсамол.

Будуць праведзены спэцыяльныя сходы сялян, прысьвечаныя пазыцы.

Асноўнымі кантрагентамі па распаўсюджаньні пазыкі зьявяцца нізавыя ячэйкі с.-г. кааперацыі і касы ашчаднясьці.

Акрамя таго, будуць выдзелены асобныя кантрагенты з вясковых актывістых. У горадзе распаўсюджаньнем пазыкі зоймецца Дзяржбанк, Сельбанк і ашчадныя касы. На цэнтральным гарадзкім рынку адкрываецца спэцыяльны ларок для продажу аблігацый у рыначныя дні.

А. С.

Адна з першых

Сялянка—член ЦВК БССР тав. Самахвалава запісалася на аблігацыю сялянскай пазыкі ў 75 руб.

Колькі павінна даць кожная акруга

Кантрольная лічба сялянскае пазыкі для Беларусі ў 3.200.000 руб. разьмеркавана наступным чынам: для Менскай акругі—608.000 р., Магілеўскай акругі—448.000 руб., Гомельскай—432.000 р., Віцебскай—384.000 руб., Аршанскай—368.000 руб., Мазырскай—256.000 р. і Полацкай акругі—192.000 р.

С.-гасп. кааперацыя—на дапамогу рэалізацыі

Белсельбанк запрапанаваў сваёй нізавой сетцы зьвязацца са сваімі пайшчыкамі, кааперацыйным актывам, арцелямі і іншымі аб'яднаньнямі для правядзеньня рэалізацыі сялянскае пазыкі. Сёньня група працаўнікоў Белсельбанку выяжджае на месцы для рэалізацыі пазыкі, а таксама вырашэньня некаторых пытаньняў, зьвязаных з ліквідацыяй запазычанасьці Белсельбанку.

Спаборніцтвы на пасьпешную падпіску

ВІЦЕБСК. (Ул. кар.). Па першым насяджэньні акруговай камісіі па дапамозе рэалізацыі пазыкі намечаны ряд мерапрыемстваў па ўзмацненьні пазыкі. Паміж раёнамі і сельсаветамі наладжваецца спаборніцтва на лепшую, больш пасьпяховую падпіску.

У кірамах, хатах-чытальнях, клубах будуць устаноўлены ліхтары для дэманстрацыі адпаведных лозунгаў.

Узгоднена з палітаддзелам дывізіі пытаньне аб пасылцы чырвонаармейцамі св ім сям'ям лістоў, якія тлумачаць значэньне і карысьць пазыкі.

У горадзе для продажу аблігацый будуць скарыстаны ларкі і крамы ЦРК і саюзу паляўнічых. Акрамя таго, будуць арганізаваны спэцыяльныя ларкі.

Я.

2-і ўсебеларускі зьезд яўрэяў-земляробаў

Посьпехі яўрэйскага замляробства

(з дакладу тав. Прышчэпава)

Чацьверты год мы праводзім работу па земляўпарадкаваньні працоўнага яўрэйскага насельніцтва,—кажа т. Прышчэпаў.

Сваёй практычнай працай мы расьсеялі тое непаразуменьне, быццам-бы яўрэйскае насельніцтва ня можа і ня здольна займацца сельска-гаспадарчай справай. Такая думка зьяўлялася і зьяўляецца перажыткам антысэмітызму.

Вашай практычнай працай вы даказалі, што яўрэі могуць займацца сельска-гаспадарчай працай і ліквідавалі гэтыя антысэміцкія перажыткі. Таму посьпех яўрэйскага земляробства—гэта ёсьць посьпех ня толькі па ўцягненьні працоўнага яўрэйскага насельніцтва ў сельска-гаспадарчую вытворчасьць, а гэта ёсьць і посьпех на фронце барацьбы з антысэмітызмам, які нам застаўся ў спадчыну ад мінуўшчыны.

Мы маем усе магчымасьці, нармальным парадкам праводзіць працу па землянадзяленьні працоўнага яўрэйскага насельніцтва ўнутры Беларусі ў роўнай ступені, як мы праводзім землянадзяленьне іншых нацыянальнасьцяй, якія зьяўляюцца безьзямельнымі, або мала ямельнымі.

Гр. Колатаў, дэлегат ад калхозу „Зарэчча"

Для ўрэгуляваньня яўрэйскага землянадзяленьня мы стварылі адпаведны апарат: Белкамзет і яго аддзелы.

Пры земляўпарадкаваньні працоўных яўрэяў мы ў аснове трымалі курс на буйное калектыўнае земляробства ў большай ступені, чым мы ўжывалі ў адносінах іншых сялянскіх гаспадарак. Гэта таму, што яўрэйскае насельніцтва—гэта новы элемэнт у сельскай гаспадарцы, не заражаны ніякімі забабонамі.

Зараз мы маем больш 9.000 яўрэйскіх сем'яў, якія займаюцца сельскай гаспадаркай. Мы маем 170 калектыўных гаспадарак. Гэтыя нова-арганізаваныя калектывы зьяўляюцца пака альнымі гаспадаркамі, таму што яны становяцца на шлях арганізацыі тэхнічных прадпрыемстваў па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчага сырцу. Лічбы паказваюць, што яўрэйскія гаспадаркі сталі на шлях травасеяньня, жывёлагадоўлі, на шлях разьвіцьця індустрыялізацыі гаспадаркі.

Мэліярацыйныя землі, якія мы думаем працастаўляць для землянадзяленьня яўрэяў, павінны зваль нацца, пасьля таго, як за ачацца ўсе работы па калёнізацыі, на 5-7 год ад усякіх падаткаў.

Важнаю галінаю нашае працы зьяўляецца гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчак. Зараз становішча местачковага яўрэйскага насельніцтва вельмі дрэннае.

Мястэчкі ў недалёкім будучым павінны зьяўляцца цэнтрамі індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі і разьвіцьця саматужных промыслаў (пераапрацоўка малака, бульбы, фруктаў і г. д.) Арганізуючы ўсякія тэхнічныя прадпрыемствы па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчага сырцу; праводзячы земляўпарадкаваньне, землянадзяленьне, арганізуючы інтэнсыўныя садова-гародныя гаспадаркі, я думаю, наша задача на арганізацыі яўрэйскага насельніцтва мястэчак будзе вырашана.

На ранішнім пасяджэньні 24-га студзеня з дакладамі аб сваёй дзейнасьці выступілі прадстаўнікі яўрэйскай сельска-гаспадарчай школы ў Курасоўшчыне і прадстаўнікі калектыву «Пахар», Магілеўскай акругі.

24-га студзеня на вячэрнім пасяджэньні, перад зачыненьнем зьезду выступіў з прамовай сакратар ЦК КП(б)Б тав. Кнорын.

Дэлегаты зьезду: гр. Коган і Запрудзкі

ШМАТ ГАВОРАЦЬ, АЛЕ МАЛА РОБЯЦЬ

АБ ЯБЛЫКАХ, КВАШАНАЙ КАПУСЬЦЕ І СОЛЕНЫХ ГУРКОХ

ЗАГАТОЎШЧЫКІ ГРЫЗУЦЦА, А ПРЫВАТНІК ЗА ІХ СЬПІНОЮ ГАСПАДАРЫЦЬ НА РЫНКУ

БССР зьяўляецца краінаю пераважна землеробчаю і зусім зразумела, што асноўныя віды нашага экспарту—прадметы сельскае гаспадаркі: лён, пянька, шчаціна, яйкі і інш. Апрача таго, з БССР вывозіцца пушніна (віёрка, заяц, тхор, воўк, ліса і інш.), скураны сырэц (аўсок, жарабок і інш.), конскі волас і лекавыя травы. У экспарце крамтавараў БССР удзельнічае надзвычайна слаба. Да гэтага часу вывозілася тарпатына і смала. У гэтым годзе будзем вывозіць таксама і залалкі.

У вялікай колькасьці вывозіцца лес. Каб узмаціць экспарт, Наркамгандаль узлажыў на кожную арганізацыю абавязковы кантынгент экспарту па заўчасна распрацаваных плянах. Як-жа ідзе выкананьне экспарту.

Паводле квартальны плян сумарна выканан амаль поўнасьцю. Але на асобных відах ёсьць вялікае недавыкананьне. Так, ільнянога семя, пянькі, скурсырцу, шчаціны і конскага волосу ў гэтым годзе загатоўлена значна менш, як летась за гэты ж перыяд. Нашы дзяржаўныя і кааперацыйныя загатоўшчыкі не выступаюць салідарна, часта грызуцца п між сабою і не прыкмячаюць, як прыватнік за іх сьпіною ўзмацняе свой уплыў на рынку. У выніку гэтага загатоўчыя цэны павялічваюцца і сырэц ад нас зьнікае.

У нас няма ня толькі вучоту прыватніка, няма нават вучоту саматужніка, які таксама загатаўляе розныя роду сырэц: скурсырэц, конскі волас і лекавыя травы.

Саматужна-прамысловы саюз павінен энэргічна ўзяцца за арганізацыю саматужніка-адзіночкі і саматужніка, аб'яднанага ў арцелі. Неабходна паставіць пытаньне аб забесьпячэньні арганізаванага саматужніка сырцом, увесьці яго работу ў карыснае для дзяржавы рэчышча. У Шклоўскім раёне, напрыклад, усімі дзяржаўнымі і кааперацыйнымі загатоўшчыкамі не загатоўлена ніводнай конскай скуры, а ў аднаго «саматужніка» знойдзена 600 штук. Скуры гэтыя купляюцца па павышаных цэнах і ў відзе паўфабрыката прадаюцца крамнікам, а да спажыўца ўжо даходзяць з падбаўкаю ў некалькі сот процантаў. Тое самае наглядаецца з цэлым радам іншых прадметаў. Між тым пры дружнай і правільнай рабоце нашых дзяржаўных і кааперацыйных загатоўшчыкаў такіх зьявішч было-б значна менш.

Трэба яшчэ зазначыць, што цэлы рад патрэбных нам тавараў вывозіцца з межаў БССР, хоць нашы Дэрабкопы маюць іх у вельмі абмежаванай колькасьці. Так, спажывецкая кааперацыя Аршанскае акругі і сельска-гаспадарчая кааперацыя Магілеўскае акругі вывозілі крупы, у якіх адчуваюць вялікую патрэбу нашы гарады.

Вывозяцца і прадаюцца па ўнутраных рынках экспартныя тавары: грыбы, пушніна і інш. Кааперацыйныя арганізацыі яшчэ вельмі мала ўвагі зьвяртаюць на загатоўку экспартных тавараў, асабліва другарадных. Між тым, у нас ёсьць цэлы рад тавараў, экспарт якіх можна разьвіць, калі правільна арганізаваць іх пераапрацоўку.

Так, мы ў гэтым годзе ўпяршыню зрабілі спробу экспартаваць яблыкі (антонаўку). Між тым, з прычыны дрэннага сартаваньня, тавар атрыман за граніцаю папсаваным і нам прышлося іх прадаваць па вельмі нізкіх цэнах. Гэта практыка павінна быць улічана нашымі экспартэрамі. Потым трэба паклапаціцца аб арганізацыі вырабу яблычнага пюрэ і сушкі фруктаў, у якім відзе яго лепш экспартаваць і можна прадаваць на лепшых умовах. Гэта таксама дасьць некаторае зьмяншэньне беспрацоўя ў нас. Тое самае з экспартам ягад. Нашы журавіны ня маюць збыту за граніцаю, у той час, як збыт журавіннага экстракту забясьпечаны.

Для абсталяваньня такога заводу вялікіх сродкаў ня трэба, і мне здаецца, гэтым павінна зацікавіцца кіраўніцтва працакалектывамі. Усю вытворчасьць, бязумоўна, дзяржгандаль закупіць для экспарту.

Неабходна таксама палепшыць загатоўку і пераапрацоўку кішак. Трэба дапушчаць, што дзяржгандаль, да якога зараз перайшла гэта работа, зьверне на гэта пытаньне досыць увагі.

Слаба разьвіты ў нас крухмальная і патачная вытворчасьць. Замест вывазу бульбы мы маглі-б вывозіць крухмаль і патаку. У гэтым годзе мы ўпяршыню экспартавалі за граніцу некалькі вагонаў бульбяное мукі і трэба сказаць, што наш крухмал значна горшы ад заграніччнага. Выяўляецца таксама магчымасьць экспарту сыру, шпалераў і іншых прадметаў нашае вытворчасьці.

Адпраўлена за граніцу таксама некалькі вагонаў квашанае капусты і соленых гуркоў.

Прышлося гэтыя тавары прадаць па вельмі нізкіх цэнах з прычыны дрэннага сартаваньня гуркоў, а таксама дрэннай засолкі і дрэннай тары.

Трэба, каб кааперацыя на будучы сэзон арганізавала сваю ўласную засолку і заўчасна падрыхтавала патрэбную тару. Можна разьвіць і гэты тавар для экспарту.

Зборка і загатоўка ануч у нас пастаўлена вельмі дрэнна. Сотні пудоў іх прападаюць у вёсках. Між тым яны нам неабходны, як для нашай папяровай прамысловасьці, так і для экспарту. Няважна стаіць справа і з апрадоўкаю і ўпакоўкаю ануч.

Ёсьць яшчэ цэлы рад прадметаў, якія мы можам [illegible] для экспарту. Патрэбна толькі ініцыятыва і правільна прадуманая работа.

Цэлы рад тавараў, якія мы што год вывозім, патрабуе палепшаньня якасьці. Так, напр., гусі і яйкі. Добрыя пароды гусей, так званыя шматныя, разводзяцца толькі ў Віцебскай і Полацкай акругах. Гомельская і Бабруйская акругі разводзяць «камэрунаў». Апошнія даюць мала шмальцу і патрабуюць шмат корму. З гэтай прычыны яны за граніцаю маюць малы збыт.

З прычыны дрэннае якасьці нашых курэй, яны нясуць мала яек і горшай якасьці, як напр., украінскія. З прычыны гэтага яйкі з БССР за граніцаю прадаюцца значна таней. Наш Наркамзем цікавіцца гэтым пытаньнем і праводзіць некаторыя мерапрыемствы для палепшэньня птушніцтва, але, мне здаецца, невыстарчальна. Гэта пытаньне заслугоўвае значна большае ўвагі, як гэта робіцца дагэтуль. А вось пытаньням трусаводзтва аддаецца зусім мала увагі. Між тым трусаводзтва можа даць дадатковы заработак нашай сялянскай гаспадарцы.

Аб экспарце апошні час вельмі шмат гаворацъ, але яшчэ вельмі мала робяць. Гэтымі пытаньнямі павінны зацікавіцца ня толькі партыйныя і ўрадавыя органы, але і ўсе гаспадарчыя і вытворчыя арганізацыі. Тут шмат работы, як для дзяржгандлю і кааперацыі, так і для ВСНГ, Наркамзему, Наркампрацы (працакалектывы) і інш.

Да гэтага пытаньня трэба прыцягнуць увагу ўсёй нашай савецкай грамадзкасьці.

Ш.

Пераабсталяваньне Бярэзінскае сыстэмы

ПАГЛЫБЛЕНЬНЕ І ПАШЫРЭНЬНЕ РЭК І КАНАЛАЎ.—НОВЫЯ ГІДРАТЭХНІЧНЫЯ ПАБУДОВЫ.—ПА БЯРЭЗІНСКАЙ СЫСТЭМЕ БУДУЦЬ ХАДЗІЦЬ БУЙНЫЯ СУДЫ

800 РАБОЧЫХ ЗАНЯТЫ ЗАРАЗ РАМОНТАМ

Прыехаўшы ў Менск начальнік паўночна-заходняй краёвай управы водных шляхоў тав. Яркін паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае адносна становішча Бярэзінскай воднай сыстэмы і яе далейшых перспэктыў:

— У сучасны момант—гаворыць тав. Яркін,—на Бярэзінскай сыстэме адбываецца рамонт гідратэхнічных пабудоў, а таксама расчыстка запруджаных каналаў. Бярэзінская сыстэма падрыхтоўваецца да навігацыі 1928 г. Працуе зараз 800 рабочых.

У надыходзячую-ж навігацыю мы будзем паглыбляць і паляпшаць фарватары ракі Заходняй Дзьвіны, каб павялічыць яе глыбіню, а таксама ўпарадкаваць яе берагі.

Галоўнай перашкодай для судаходзтва і сплаву па вазёрах Бярэзінскай сыстэмы, а таксама і па каналах, зьяўляюцца водарасьлі. У навігацыю 1928 г. мы намячаем зьнішчыць гэтыя перашкоды, абсталяваўшы спэцыяльныя касілкі з маторамі. Гэтыя прылады—касілкі робяцца зараз у Ленінградзе і вясною гэтага году адбудуцца іх іспыты. У сярэдзіне навігацыі прылады будуць дастаўлены на Бярэзінскую сыстэму. Агульная сума выдаткаў на ачыстку Бярэзінскай сыстэмы ў 1927-28 г. складае 350.000 р.

Якія далейшыя пэрспэктывы Бярэзінскай сыстэмы ў сэнсе яе палепшаньня для сплаву і судаходзтва?

Яшчэ ў навігацыі 1927 г. было прыступлена да вышуканьняў у гэтым напрамку. Займалася гэтым спэцыяльная вышукальная партыя пад кіраўніцтвам інжынэра Ваўкушэўскага. Зараз мы працуем над матар'ялямі гэтых вышуканьняў і складаем праект пераабсталяваньня сыстэмы.

Мы маем на мэце перабудаваць сыстэму такім чынам, каб пашырыць і паглыбіць яе для пропуску суднаў тыпу Марыінскай сыстэмы, каб маглі праходзіць судны на асадцы ў 10 чвэртак (130 см.), груза-падъёмнасьцю ад 15 да 20.000 пуд., даўжынёю ў 35 саж. і шырынёю ў 4 з пал. саж.

Прадугледжваецца часткова зьмяніць напрамак старое сыстэмы. Так, напрыклад, для большай выгады для судаходзтва трэба будзе ліквідаваць Сяргучэўскі і Злучальны каналы з 7-ю на іх шлюзамі, абʼядноўшы раку Бярэзіну з возерам Бярэшта. Ад возера Бярэшта сыстэма пойдзе старым шляхам па рацэ Эсса.

У раёне вёсак Вярэскі і Куляшы мяркуецца пабудаваць новую заставу і шлюз разьмераў тыпу Марыінскай сыстэмы з глыбокай асадкай. Іншыя абсталяваньні прадугледжваецца пабудаваць на рацэ Ула, у раёне Чашнікі, дзе закругленьне ракі Улы будзе выкінута і рака будзе абʼяднана перакопам. На пабудаваных абсталяваньнях і заставе будзе ўстаноўлена гідра-электрычная станцыя для асьвятленьня раёну. На нізінах ракі Улы будуць пабудаваны два абсталяваньні, заставы і шлюзы. А рака Ула з ракой Заходняя Дзьвіна ў раёне Гайдукоўкі будзе абʼяднана перакопам. Тут таксама прадугледжваецца пабудаваць гідра-электрычную станцыю.

Такім чынам, вызьвіцца магчымым мець добры судаходны шлях з затратай невялікай колькасьці сродкаў. Гэты новы водны шлях ажывіць мясцовую гаспадарку і забясьпечыць яго гаспадарчае разьвіцьцё.

Работы, якія зараз разгарнуліся на Бярэзінскай сыстэме, тармозяцца, галоўным чынам, дзякуючы таму, што ачыстцы не ўдзяляюць увагі арганізацыі вельмі зацікаўленыя ў напраўцы сыстэмы. У прыватнасьці трэба адзначыць Лесбел, які абавязаўся даставіць лясныя матар'ялы і адносіцца да сваіх абавязкаў ня зусім уважліва. Замест, напрыклад, будаўнічага матар'ялу, які патрэбен для пабудовы абсталяваньняў, ён імкнецца здаць нам брак, які не падыходзіць па тэхнічных умовах. Адзіная арганізацыя, якая сумленна выконвае свае абавязкі, гэта Дзьвіналес, пастаўкі якое даюць магчымасьць выканаць заданьне ў тэрмін.

КУЛЬТУРНЫЯ НАВІНЫ

Аб катлох гарачага крупніку, сьвітках, чаравічках і беларускім мастацтве

(На вечары ў Доме Культуры)

...Народны паэта застанавіўся каля расчыненага раяля і выняў з кішэні лісток. Ён пачаў чытаць ціха і ў першыя хвіліны нельга была ўлавіць словы. Шырокімі нямымі кругамі распывалася па залі цішыня і ў гэтай цішыні ўсё мацней гучэлі і поўнаважка падалі гострыя насычаныя радкі:

„...Яшчэ там корна служаць
мамкамі
Сястрыцы нашы і сягоньня,
Ды стогнуць, мучацца пад клямкамі
Браты, як некалі ў прыгове".

Гэтыя вядомыя Купалаўскія радкі, прысьвечаныя Заходняй Беларусі, выразна падкрэсьлівалі асноўны зьмест сёньняшняга вечару ў Доме Культуры. Так, ні ніколі, ні паводную хвіліну не забываем аб тым, што дзеецца за слупамі блізкай граніцы, аб тэй крыўдзе, пра якую шумяць верхавіны Беларускае пушчы. Кожны грамадзянін нашай рэспублікі пільна сочыць за барацьбой рабочых і сялян Заходняй Беларусі. Але сачыць мала. Трэба прыйсьці на дапамогу гэтай барацьбе, падтрымаць нашых заходніх братоў. І ў першую чаргу трэба дапамагчы тым тысячам пакрыўджаных лёсам дзяцей бяднейшых рабочых і сялян Заходняй Беларусі, якія павінны будуць будаваць новае жыцьцё сваёй бацькаўшчыны.

Аб гэтым гаварыў, адчыняючы вечар ад імя ЦК Чырвонага Крыжу Беларусі, тав. А. Цьвіневіч.

Тыя сотні рублёў, якія выручаны сёньня за білеты, тыя груды сараковак, якія „выкачаны" з кішэняў публікі бойка працаваўшай лётарэяй-алегры, пойдуць за мяжу, ператварацца ў катлы гарачага крупніку, у цёплыя сьвіткі, чаравічкі і рукавіцы для зморанай галоднай дзетвары крэсаў.

Гэта—адно. А падругое—аб самым вечары, аб яго праграме. Трэба сказаць, што ў нас радка, вельмі рэдка так добра, так прадумана прасоўваюць ў масы беларускае мастацтва, прапагандуюць яго. Цэльная, гарманічна-спаяная праграма сёньняшняга вечару можа служыць узорам таго, як трэба выхоўваць любоў да беларускага мастацтва, адчыняць перад вачыма пралетарскай аўдыторыі яго чароўныя глыбіні.

Жарт Аляхновіча „Чорт і Баба" быў праведзен артыстамі II Дзяржтэатру з вялікім уменьнем і смакам. Пяштучны народны гумар, якім дыша гэта аднаактоўка, добра ўспрымаўся аўдыторыяй—рэагаваньне на паасобныя моманты было хосьць актыўнае. Асабліва трэба адзначыць гульню Ільінскага, які віртуозна выканаў ролю чорта.

У літаратурнай частцы вечару прыймалі ўдзел Купала, Колас і Гартны. Паэты чыталі свае творы, прысьвечаныя Заходняй Беларусі.

...І вершы, і музыка, якія гучэлі на вечары, былі разьнесены хвалямі эфіру па ўсіх куткох Эўропы. Можа дзе-небудзь над Вільняй, над Горадняй нас таксама ўважліва слухаў невядомы заходні брат.

А панове, дык яны напэўна пачулі! Невядома толькі, наколькі вялікую асалоду гэта зрабіла ім...

* * *

Вечар даў **1200 рублёў**, якія будуць перасланы ў бліжэйшыя дні за мяжу. Акрамя таго, Цэнтральная камісія дапамогі дзецям пры ЦВК БССР асігнавала яшчэ **5.000 рублёў** на карысьць бяднейшых дзяцей рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

Міх. Г.

Беларусь у „Большой Советской Энциклопедии"

Для падрыхтоўкі і рэдагаваньня матар'ялаў пра БССР у „Большой Советской Энциклопедии"—БСЭ, пры Савеце Народных Камісараў БССР утворана спэцыяльная камісія.

Паміж камісіяй і рэдакцыяй БСЭ дасягнута згоды аб тым, што ўсе матар'ялы, якія датычаць БССР і якія будуць вымяшчацца ў БСЭ на яе ініцыятыве, будуць прысылацца абавязкова на заключэньне гэтай камісіі. Рэдакцыя БСЭ таксама згадзілася вымясьціць у БСЭ ўсе словы і артыкулы пра БССР, якія будуць накіроўвацца камісіяй.

Асьвядамляючы аб гэтым і лічачы вузкім бяспрэчнай вялікую патрэбу вымясьціць у БСЭ як мага паўней матар'ялы пра Беларусь і бяручы пад увагу важнасьць гэтай справы, камісія зьвярнулася па ўсіх наркаматаў, цэнтральных установаў і акруговых выканаўчых камітэтаў з просьбай зараз-жа зрабіць патрэбныя канкрэтныя захады да сваячасовага складаньня, апрацоўкі і прысылкі ў камісію СНК усіх слоў, тэм, імён, якія, на думку гэтых устаноў, павінны быць вымешчаны ў БСЭ, а таксама адзначыць тыя памылкі і пропускі, якія імі заўважаны ва ўжо выданых томах БСЭ і якія можна будзе выправіць і вымясьціць у дадатковых томах БСЭ.

Да гэтага часу здылося некалькі пасяджэньняў камісіі СНК, якая разглядзела рад матар'ялаў, прысланых ёй на заключэньне і прызначаных для БСЭ. Так, разгледжан артыкул аб рэвалюцыйным руху на Віцебшчыне, аб аўтабіяграфіі прафэсара Вальфсона, аб слоўніку слоў па расійскай гісторыі, аб слоўніку слоў па сусьветнай гісторыі, па гэаграфіі і інш.

З гэтага часу ўсе матар'ялы, якія датычаць БССР і прызначаюцца для БСЭ, павінны накіроўвацца ў камісію СКН на прагляд і заключэньне.

А. М.

Правы на нацыяналізаваныя і муніцыпалізаваныя будынкі

Дзяржплан распрацаваў і ўносіць у СНК праект пастановы ЦВК і СНК БССР аб нацыяналізаваных і муніцыпалізаваных будынках і аб парадку карыстаньня імі.

Паводле гэтага праекту нацыяналізаванымі будынкамі лічацца: а) будынкі, якія належалі дзяржаве (а ня органам мясцовага самакіраваньня) да 7 лістапада 1917 г. і скарыстоўваюцца цяпер непасрэдна для сваіх патрэб адпаведнымі цэнтральнымі ўстановамі або іх мясцовымі органамі, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце; б) помнікі старажытнасьці, мастацтва і быту, якія абвешчаны дзяржаўнай уласнасьцю, а таксама будынкі дзяржаўных тэатраў, бібліятэк, музеяў; в) будынкі, якія на падставе спэцыяльных пастаноў Ц К і СНК БССР прызнаны нацыялізаванымі і замацаваны за цэнтральнымі ведамствамі, калі гэтыя будынкі поўнасьцю або ў б льшай частцы скарыстоўваюцца тымі ўстановамі, за якімі яны былі замацаваны, а таксама будынкі, якія фактычна знаходзяцца ў карыстаньні цэнтральных устаноў або іх мясцовых органаў; г) будынкі, якія складаюць неабходную належнасьць нацыяналізаваных фабрык, заводаў, транспарту і неразрыўна зьвязаны з іх вытворчасьцю, д) будынкі, спэцыяльна пабудаваныя для патраб вайсковага ведамства; е) будынкі, якія знаходзяцца на тэрыторыі дзяржаўных зямельных маемасьцяй і скарыстоўваюцца ў парадку, паказаным зямельным кодэксам.

Усе іншыя будынкі, якія складаюць уласнасьць дзяржавы, лічацца муніцыпалізаванымі. Нацыяналізаваныя будынкі знаходзяцца ў веданьні і распараджэньні адпаведнага народнага камісарыяту або іншай цэнтральнай установы, а муніцыпалізаваныя будынкі знаходзяцца ў веданьні мясцовых выканаўчых камітэтаў.

Ведамствы і мясцовыя органы маюць права распараджэньня нацыяналізаванымі і муніцыпалізаванымі будынкамі ў межах законаў, выданых па гэтым пытаньні.

Усе наркаматы і іншыя цэнтральныя ўстановы павінны скласьці сьпісы ўсіх будынкаў, якія знаходзяцца ў іх веданьні, а сьпісы будынкаў, якія ўваходзяць у склад дзяржаўных прадпрыемстваў і транспарту, складаюцца ВСНГ, акрвыканкомамі і НК шляхоў зносін па належнасьці.

Для разгляду сьпісаў утвараюцца акруговыя камісіі, якія пасьля разгляду гэтых сьпісаў перадаюць іх у НК унутраных спраў, які ў сваю чаргу складае зборны сьпіс і ўносіць яго на зацьверджаньне СНК.

А. М.

Курс краязнаўства ў ВНУ.

У Цэнтральным Бюро краязнаўства Беларусі быў разгледжаны праект праграмы курсу краязнаўства ў вышэйшых і спэцыяльных школах. Паводле праекту, краязнаўства будзе выкладацца на 3-м курсе ў працягу году з разьлікам 2 гадзіны ў тыдзень.

Раённыя слоўнікі народнае мовы

Пад кіраўніцтвам ЦВК мясцовыя краязнаўчыя таварыствы займаюцца ўкладаньнем слоўніку народнае мовы раёнаў. Як зьбіраць гэты матар'ял, ЦВК апрацавала спэцыяльныя інструкцыі, якія разасланы па мясцох.

Праца па ўсеагульным навучаньні

У сучасны момант на мясцох (у акругах і раёнах) вядзецца праца па складаньні дакладных плянаў усеагульнага навучаньня і тэрытарыяльных сетак школ на падставе даных дэмографічнага перапісу і апошняга школьнага перапісу.

Працу гэтую мяркуецца закончыць у канцы сакавіка месяца, калі будзе склікана парада акруговых працаўнікоў для абмеркаваньня і падсумаваньня гэтай працы.

„Пэдтэхнікум на даму"

Навуковы мэтадычны камітэт пры НКА зрабіў захады да ўкладаньня праграм для „пэдтэхнікумаў на даму".

Даюцца заданьні спэцыялістым настаўнікам для распрацоўкі праграм па наступных дысцыплінах: матэматыкі, біялёгіі, літаратуры, фізыцы, хэміі, гісторыі клясавай барацьбы, неарганічнай прыродзе і інш.

Аб адчыненьні дасьледчага пэдагагічнага інстытуту

У Менск прыехаў навуковы працаўнік Ленінградзкага інстытуту на вывучэньні мозгу т. Ільінскі, які працаваў пад кіраўніцтвам акадэміка Бехцерава.

Тав. Ільінскі будзе весьці перамовы з Народным Камісарыятам Асьветы аб адчыненьні ў БССР навукова-дасьледчага пэдагагічнага інстытуту.

Настаўніцкія курсы па акругах

Н. К. А. зараз распрацоўвае плян па адчыненьні летніх акруговых настаўніцкіх курсаў.

Паводле бюджэту настаўніцкія курсы будуць адкрыты па ўсіх акругах Беларусі ў сярэднім на 60 асоб на акругу.

СУД

На хрысьцінах

Сымон Панфілаў (вёска Фядотаўка, Гарадоцкага раёну) спраўляў хрысьціны. Каля хаты яго было шумна і весела. Сабралася радня і знаёмыя. На хрысьціны прышоў і брат Панфілава Янка. У хаце чулася жвавая гутарка, а падчас даносіліся на двор сьпевы і моцны рогат.

Панфілаў чалавек гасьцінны. Ад шчырага сэрца частаваў гасьцей. Расьпівалі ўжо 12 пляшку самагону.

Душна стала ў хаце. Пачалі выходзіць госьці на двор, каб прасьвяжыцца на чыстым паветры. Выйшаў і брат Панфілава Янка з Пракапенкам.

У гэты час ні з таго, ні з сяго паміж гасьцямі распачалася бойка. Слова за слова сашчапіліся паміж сабою і Янка з Пракапенкам.

Першым прыстаў Янка. Ён накінуўся на Пракапенку і схапіў яго за горла. Пачалі зьбягацца людзі. П'янаму, як кажуць, і мора па калені. Пракапенка выхваціў з кішэні нож, і хоць яму асаблівай небясьпекі не пагражала, парнуў Панфілава ў бок. Панфілаў пасьля гэтага выпадку пралежаў у больніцы каля месяцу і памёр.

Віцебскі акруговы суд знайшоў, што Пракапенка наўмысьля зрабіў цяжкае калечаньне Панфілаву і таму прыгавараў яго на 6 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, скараціўшы па амністыі кару на палову.

Вярхоўны суд гэты прыгавар пакінуў у моцы.

«СПОРТ»

2-гі дзень Усебеларускай спартакіяды

Пушыстыя сьняжынкі абляпілі разружаеўшыя трары фізкультурнікаў. Іх 48. Па лыжах яны накіроўваюцца ва ўрочышча „Тры карчмы". Сюды прыбылі прадстаўнікі ад Акруговага Савету фізкультуры і ад усіх акруг.

Перад фізкультурнікамі пасьціляй распрастрыліся белыя абшары.

На твары кожнага лыжніка можна ўгледзець нейкую задуменасьць, кожны з іх марыць узяць першае месца.

У гэтым годзе ў першы раз у рэспубліканскім маштабе праводзяцца спаборніцтвы па лыжах і канькох. Так, тыя фізкультурнікі, якія пакажуць лепшыя посьпехі, будуць накіраваны на Усесаюзную спартакіяду. На ўсесаюзных спаборніцтвах ад БССР прыме ўдзел 35 чал.

Тав. КАЦЭГАРАВА—узяла першае мейсца з жаночае каманды па бегу на 3 кілёмэтры.

Ва Ўсебеларускай спартакіядзе прымаюць удзел калектывы ўсіх акруг. Тут мужчыны і жанчыны.

З 48 фізкультурнікаў 21 жанчына.

— Паша возьме—сьмяюцца фізкультурнікі Менску. Мы будзем на першым месцы. Паміж фізкультурнікаў, рэплікі, жарты...

Судкалегія ўважліва сочыць за тэрмінам, за посьпехам кожнага лыжніка. Запісваецца ўсё ў пратаколах.

Мужчыны-лыжнікі бралі адлегласьць на 5 кілёмэтраў, а жанчыны на 3.

Вось вынікі... Вынікі сёньняшніх спаборніцтваў па лыжах: з мужчын на першым месцы ідзе Валкоўскі (Менск), які ўзяў 5 кілёмэтраў у 22 хв. 57,4 сэк., другое—паміма конкурсу—ўзяў Дынэштэйн (Менск)—24 хв. 15 сэк., трэцяе—Тарасаў (Віцебск)—24 хв. 34,4 сэк.

Пе адсталі ад мужчын і жанчыны. Яны таксама паказалі добрыя вынікі, бяручы адлегласьць на 3 кілёмэтры.

На першым месцы ідзе Кацэгарава (Гомель), узяўшы 3 кілёмэтры ў 17 хв. 45 сэк., другое—Шаўчэнка—(18 хв. 4,8 сэк.), трэцяе—Сашко (18 хв. 8 сэк).

З радасьнымі тварамі зьвярнуліся фізкультурнікі ў Менск.

Фізкультурнікі БССР здадуць з гонарам свой экзамен.

Ул. Б.

Спартыўная хроніка

— 23 студзеня ў піянэрскім клюбе (б. кірха) адбылося ўрачыстае адчыненьне ўсебеларускай спартакіяды.

— Адбыліся спаборніцтвы па барацьбе і ўзьняцьцю цяжнасьцяў. Першая пара—Новікаў (Менск) супроць Патучыка (Бабруйск). Перамог Новікаў—2 мін. 11 хвіл. 2-ая пара—Анцінаў (Менск) супроць Шаматульскага (Магілеў). Перамог Анцінаў—6 мін. 19 хвіл. 3-я пара—Гулака (Бабруйск) і Бярозкін (Менск). Перамог Бярозкін—13 мін. 46 хвіл.

— Зьняў двумя рукамі. У паразе ваг першае месца занялі: Савіч—67 кілё, Равіч-Бах і Славін—67 кілё, Ючеп Юроўскі—72 кілё, Сьвечнікаў—72 кілё, Кузьмін—72 кілё.

МЕНСК

Забесьпячэньне гораду хлебам

МЦРК у сучасны момант мае запасаў мукі для выпечкі хлеба на адзін-паўтара месяцы. Аднак, пякарні ЦРК ня маюць тэхнічнай магчымасьці выпячы столькі хлеба, каб забясьпечыць усё насельніцтва Менску. Пякарні выпускаюць да 1.000 пудоў хлеба ў дзень. Апрача таго ЦРК часта адпускае муку працакалектывам пекароў.

У першых лічбах лютага пачне працаваць хлебазавод, дзякуючы чаму колькасьць выпускаемага хлеба значна павялічыцца. Пры поўнай нагрузцы заводу ён будзе выпякаць да 3.000 пудоў хлеба ў дзень і зможа забясьпечыць каля 70 проц. спажыўцоў.

Прэмія БДВ

На ўсесаюзнай паліграфічнай выстаўцы, якая нядаўна закончылася, з нацыянальных выдавецтваў Беддзяржвыдавецтва атрымала другую прэмію і дыплём.

Першы дыплём атрымаў ГИЗ РСФСР, а трэці—Украіна. У дыплёме адзначаецца ўважлівая апрацоўка і друкаваньне беларускіх кніг.

Экспарт беларускай смалы

У гэтым годзе Бел. саматуж. прамыс. саюз экспартаваў за граніцу да 1 т. тон розных смалапрадуктаў на суму каля 150 тыс. р. Гэтымі днямі ён адпраўляе за граніцу першую партыю беларускага шпігунару.

Нарада зямельных працаўнікоў Меншчыны

На 21 лютага склікаецца нарада зямельных працаўнікоў Менскай акругі. На нарадзе будуць абгаворвацца пытаньні: аб задачах партыі па працы ў вёсцы, даклад акрза аб правядзеньні сел.-гасп. кампаніі на 1928 г., аб стане сельска-гаспадарчай кампаніі і савецкіх гаспадарках.

Крэдыт рабочым

У працягу першага месяца аднаўленьня крэдытаваньня МЦРК выдаў рабочым і служачым Менску крэдытных талёнаў на суму каля 200.000 руб. Крэдытаваньне працягваецца.

ЗА ДЗЕНЬ

ДРУГАЯ ЗЬМЕНА НА ШПАЛЕРНАЙ ФАБРЫЦЫ. Для ўзмацненьня выпрацоўкі прадукцыі на менскай шпалернай фабрыцы імя Вароўскага ўведзена другая зьмена.

ЛІКПУНКТЫ НА ДАМУ. На Менскім вучастку Заходняй чыг. арганізаваны рад пунктаў па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод чыгуначнікаў і членаў іх сем'яў на даму.

Здарэньні

— Замах на забойства сакратара сельсавету. Управай крымвышуку рэспублікі атрымана паведамленьне аб замаху на забойства сакратара Несімкавіцкага сельсавету, Чачэрскага раёну, І. Івашкова. Дзякуючы выпадковасьці, Івашкоў застаўся жывым. Страляўшы ў яго, вядомы рэцыдывісты грабежнік Дуброўскі хацеў забіць Івашкова за яго барацьбу са злачынствамі. Дуброўскі затрыман.

— Старшыня каапэратыву—растратчык. Старшыня Слідцкага спажывецкага таварыства Паўлюк растраціў 640 р. каапэратыўных грошай. Растратчык прыцягваецца да судовай адказнасьці.

— Гвалтаўнікі. У вёсцы Повае-Закружжа згвалтавана А. Р. Гвалтаўнікі-жыхары гэтай-жа вёскі Камароў, Калугін і Кондаў затрыманы.

— Сямейная трагэдыя. На хутары Хвошчы, Чарэйскага раёну, В. Маляўцаў зарэзаў сваю жонку Марыю, а потым сам павесіўся. Прычына гэткай разьвязкі—сямейныя спрэчкі.

— Аматары гусінага шмальцу. Па Бірасавым завулку, д. № 8, у К. Бляевіч украдзена з кватэры 2 п. гусінага шмальцу і 1 п. мяса коштам у 100 руб.

— Арышт грабежнікаў. У Жлобінскім раёне нядаўна быў ограблен на 904 р. жыхар мястэчка Гарвалі Л. Хейман. Па гэтай справе затрымана 3 чалавекі.

— Абакралі школу. Вучань 32-й школы М. Чырка сумесна з С. Ракеем і С. Дайноўскім у часе канікул пакрадзі кладовай школы розныя канцылярскія прылады. 4-ае аддзяленьне міліцыі пакражу выкрыла.

Паведамленьні

— Сёньня, 25 студзеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у Доме Працаўсьветы адбудзецца сход актыву шафскіх вобчастваў з наступнай павесткай дня:

1) Аб удзеле ў распаўсюджваньні сялянскага займу.

2) Аб падрыхтоўцы к вясеньняй пасяўной кампаніі.

— У сераду, 25 сьнежня 28 г., а 7 г. увечары ў памяшканьні 31-й школы самігодкі (Нова-Маскоўская, 64), адбудзецца дэлегацкі сход работніц, жон рабочых і служачых Кастрычнікавага раёну.

Лука ўсіх дэлегатак абавязкова.

Дом Асьветы.

— У сераду, 25 студзеня, а 6 гадз. увечары склікаецца сход беспрацоўных членаў саюзу працасьветы з падпэрсаналу і іншых, якія маюць спрэднюю адукацыю.

Лука абавязкова.

— Агульны сход сяброў саюзу працасьветы 3-га групкому адбудзецца 25-1 а 7-й гадзіне вечару, у памяшканьні 3-й школы (Міхайлаўская вул., № 4, 4 паверх)

Клуб гарбароў.

— У сераду, 25-1 а 7 гадз. увеч. будзе слухацца справа рабочага І працакалектыву абуўнікоў Гарэліка ва абвінавачваньні ў хуліганстве і за парушэньне парадку ў клюбе.

Адказны рэдактар Ян АСЬМОЎ.

Інстытут экспэрымэнтальнай эндакрыналёгіі

Захворваньні залоз унутраное сэкрэцыі.—Новыя мэтады лячэньня.—Амаладжэньне.—Беларускае таварыства эндакрыналёгіі.

У Менск прыехаў намесьнік дырэктара дзяржаўнага інстытуту экспэрымэнтальнай эндакрыналёгіі доктар Абрамовіч.

Мэта яго прыезду—наладзіць сувязь з навуковымі сіламі Беларусі для сумеснага вывучэньня пытаньняў дзейнасьці залоз унутраной сэкрэцыі.

Доктар Абрамовіч з прычыны гэтага меў гутарку з радам прафэсароў БДУ—Эльбэртам, Рубашовым, Лявонавым, Мранговіусам і інш.

25-га студзеня ў аўдыторыі пастэраўскага інстытуту адбудзецца пасяджэньне дактароў, на якім будзе вырашана пытаньне аб арганізацыі ў Менску беларускае сэкцыі таварыства эндакрыналёгаў. Праф. Рубашоў зробіць даклад на тэму: „Эндакрыналёгія ў сучаснай мэдыцыне", а д-р Абрамовіч азнаёміць з працай Маскоўскага інстытуту. У гутарцы з нашым супрацоўнікам д-р Абрамовіч паведаміў цікавыя даныя аб працы інстытуту, які зьяўляецца першым і адзіным у сьвеце. На чале яго знаходзіцца вядомы вучоны праф. Шэрвінскі.

Пытаньні эндакрыналёгіі,—гаворыць д-р Абрамовіч,—у мэдыцыне сталі настолькі актуальнымі, што бяз дэтальнага вывучэньня хвароб унутраной сэкрэцыі (шчытавіднай, парашчытавіднай, надпыркі, мазгавое залозы, падстраўнічнае, палавое, зобнае залозы), а таксама без вывучэньня функцый гэтых залоз няма магчымасьці паставіць правільны дыягназ і правільна лячыць захварэўшы арганізм.

Вялікае значэньне ў жыцьці чалавечага арганізму шчытавіднае залозы вядома. Узмоцненая дзейнасьць яе выклікае „Базэдаву хваробу" (зоб), і наадварот, скараченьне дзейнасьці гэтай залозы ці адсутнасьць яе па якіх-небудзь прычынах (апэрацыя, недарозьвіцьцё) выклікае сьлізкасьці аўсёк, міксэдэму, кретынізм.

Вялікае значэньне палавых залоз, як на фізычнае функцыянаваньне арганізму, гэтак і на псыхіку, таксама вядомае.

Пры захворваньні надстраўнічнай залозы разьвіваецца цукраваё, мачавое внутраньне—дыябэт.

Гэтых некалькіх прыкладаў даволі, каб вытлумачыць вялікую ролю і значэньне нармальна функцыянуючых залоз унутраной сэкрэцыі.

Высьвятленьне іх функцый, узаемадносін паміж сабою і сувязь з вегетацыйнай нэрвовай сыстэмай і зьяўляецца асноўнай задачай Дзяржаўнага Інстытуту экспэрымэнтальнай эндакрыналёгіі.

Адначасна шырока распрацоўваюцца спосабы барацьбы з захворваньнямі ўнутраное сэкрэцыі.

Інстытутам выраблен інсулін—прапарат падстраўнічнай залозы, які дзейнічае спэцыфічна пры дыябэце. Раней гэты прапарат увозіўся з-за граніцы і каштаваў да 80 тыс. руб. у год.

Важнае значэньне пры розных нэрвовых стомленасьцях, зьвязаных з парушэньнем функцый палавой залозы, мае прапарат орхікрын, выраблены па мэтадзе акадэміка Кравкова.

У апошні год інстытут у значнай меры разьвіў сваю апэрацыйную дзейнасьць па перасадцы залоз унутраное сэкрэцыі ад малпы да чалавека, як з мэтаю амаладжэньня, гэтак і для замены арганізму страчанай залозы. Для бесьперабойнага атрыманьня апэрацыйнага матар'ялу ў Сухуме арганізаваны адзіны ў сьвеце па сваім маштабе выкавальнік для малпаў, дзе яны прадстаўлены самім сабе ў субтрапічнай мясцовасьці і маюць поўную магчымасьць размнажацца.

Адначасова распрацоўваецца пытаньне аб замене лорагакантючага мазгавага матар'ялу больш танным які месцца ў межах нашага Саюзу (ад сабакі з ажыўленай дарэчоўкай залоз. Гэтыя экспэрыменты пачаты ў Ленінградзе прыват-дацэнтам Гаспар'янам.

Арганізацыя ў Менску сэкцыі эндакрыналёгаў пры навуковым таварыстве дактароў дасьць магчымасьць весьці больш плянавую распрацоўку эндакрыналёгіі ў мясцовых умовах.

М. К—и.

ТЭАТРЫ, КІНО

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр — СЕРАДА, 25 СТУДЗЕНЯ, **„СОН У ЛЕТНЮЮ НОЧ"**, камэдыя ў трох дзеях. Пачатак а 8 з палов. гадз.

Кіно-тэатр „Культура" — Мастацкі бытавы фільм **„УХАБЫ"**. Зьвыш праграм. хроніка Савкіно № 110.

Кіно „Пралетары" — **„СУМКА ДИПКУРЬЕРА"**. Драма ў 7 ч. Пачатак сэансаў а 6, 7 з пал., 9 і 10 з п. гадз. Каса адчынена ад 5 гадз. увечары. АНОНС! | Шестая часть мира. | АНОНС!

Кіно „Чырвоная Зьвязда" — СУСЬВЕТНЫ БАЯВІК—шэдэўр кіно-тэхнікі і мастацтва **„ВАРЬЕТЭ"** (WARIETE) трагэдыя з жыцьця акробатаў у 7 частках. У галоўных ролях: эміль янінгс і ліа-дэ-путці. ШТОДЗЕННА 4 сэансы, цэны звычайныя.

Кіно „Інтэрнацыянал" — Дуглас Фэрбэнкс, Мэры Пікфорд, Ігар Тільінскі ў выдатным фільме **„ПОЦЕЛУИ МЭРИ"**, у 6 часьц. Зьвыш праграмы гастролі арт. маск. і ленінгр. эст. У ноч. сэн. Е. А. Мулатавы.

Посяджэньне дактароў г. Менску,
прысьвечанае пытаньням ЭНДАКРЫНАЛЁГІІ
— адбудзецца —
сёньня, 25 студзеня 1928 г., а 8 гадзіне ўвечары ў аўдыторыі ПАСТЭРАЎСКАГА ІНСТЫТУТУ (Нова-Маскоўская вул. д. 60).
Парадак дня:
1. Эндакрыналёгія ў сучаснай мэдыцыне—даклад праф. С. М. Рубашова
2. Дзяржаўны Інстытут Экспэрымэнтальнай Эндакрыналёгіі ў г. Маскве—паведамленьне нам. дырэктара інстытуту—д-ра А. А. Абрамовіч.
3. Аб арганізацыі сэкцыі эндакрыналёгіі ў г. Менску.
Запрашаюцца ўсе дактары, якія цікавяцца пытаньнямі эндакрыналёгіі.

К сведению сборщиков ЛЕКАРСТВЕННЫХ РАСТЕНИЙ
Белмедторг закупает лекарственные травы
сбора прошлого года.
Имеющиеся на руках лектравы просьба доставить в ближайшую аптеку (городскую или районную).
БЕЛМЕДТОРГ.

Строительству Осиновской электростанции требуется ОПЫТНЫЙ СНАБЖЕНЕЦ
(желательно с техническим образованием), хорошо знающий лесные и другие материалы, могущий самостоятельно вести работы.
Предложение с подробным жизнеописанием направлять: «ОСИНСТРОЙ БССР».

ЗАОЧНЫЕ ПРОМЫШЛЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ КУРСЫ „ПОЛИГЛОТ"
(Основ. в 1917 г.)
состоящие в ведении С.-К. КрайОНО.
ПРЕДМЕТЫ ПРЕПОДАВАНИЯ:
бухгалтерия, коммерческ. вычисл., т рг. корреспонд., делопроизводство, исправление почерка, техн.-худож. черчение, машиностроительное черчение, рисование, стенография и копирует (дефинитиф).
Занятия посредством переписки по почте специально составленными лекциями, ВПОЛНЕ ЗАМЕНЯЮЩИМИ УСТНОЕ ПРЕПОДАВАНИЕ. По окончании курса учащиеся подвергаются испытанию в спецкальн. квалифик. комиссии и получают соответствующее СВИДЕТЕЛЬСТВО.
На 1-е ноября 1927 г. на курсах состоит свыше 15.000 учащихся.
Плата помесячно от 1 до 3 рублей.
Требуйте бесплатно проспекты, программы и условия.
Адрес: Ростов на Дону „ПОЛИГЛОТ".

Адкрыта падпіска на старэйшую ў Беларусі (дванаццаты год выданьня) камуністычную газэту
На люты месяц — На люты месяц
ЗЬВЯЗДА
орган ЦК КП(б) Беларусі.
Умовы падпіскі:
На 1 год—9 р. 75 к. | На 3 мес.—2 р. 60 к.
» 6 мес.—5 р. | » 1 мес.—90 кап.
Падпіска прымаецца:
У Менску: Галоўнай Канторай газэты «Зьвязда»—Савецкая, 63, 3-ці паверх,—штодзённа ад 9—3 гадз., упоўнаважанымі Галоўнай Канторы і равносчыкамі газэты.
У Віцебску: аддзяленьнем выдавецтваў «Известия» і „Правда", Ленінская, 11.
У Гомелі: аддзяленьнем выдавецтваў „Известия" і „Правда" (Савецкая, № 17).
У Магілеве: Канторай газэты „Магілеўскі Селянін" (Ленінская, 35).
У правінцыі: аддзяленьнямі Беддзяржвыдавецтва, упоўнаважанымі Галоўнай Канторы і ўсім паштова-тэлеграфнымі канторамі.

Ленінскі сельсавет (Капыльск. раёну, Менск. акругі) выклікае на 1 лютага 1928 г. гр-ку **КОРЗУН СТАНІСЛАВУ ФРАНЦАВУ** па справе аб скасаваньні шлюбу з гр. Корзунам Якубам Кандратавічам.

Кошт абвесткі аб скасаваньні шлюбу 3 р.

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакумэнту 50 кап.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакумэнты лічыць несапраўднымі:

Пагавт Ізіксона Ш. Г., выд. Менск